# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ



Віцебск 2006

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава»

# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ

## *Вучэбна-метадычны комплекс*

*Віцебск*
*Выдавецтва УО «ВДУ імя П.М. Машэрава»*
*2006*

УДК 069(075)
ББК 79.1я73
А90

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава». Пратакол № 2 ад 11.11.2006 г.

Аўтар-складальнік: выкладчык кафедры гісторыі Беларусі УА «ВДУ імя П.М. Машэрава» **Г.У. Савіцкі**

Рэцэнзент: загадчык кафедры гісторыі Беларусі УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.У. Акуневіч

**А90** Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі: Вучэбна-метадычны комплекс / Аўт.-склад. Г.У. Савіцкі. - Віцебск: Выдавецтва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2006. – 65 с.

ISBN 985-425-695-2

Вучэбна-метадычны комплекс прызначаны для студэнтаў V курса спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» дзённай формы навучання. Ён уключае ў сябе вучэбную праграму, канспект лекцый, планы семінарскіх заняткаў, пытанні да заліку

**УДК 069(075)**
**ББК 79.1я73**

**ISBN 985-425-695-2**

© УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2006

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 4

ПРАГРАМА КУРСА «АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ» ........ 5

РАЗДЗЕЛ І. Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі. Гісторыя рэстаўрацыйнай дзейнасці ........ 12

РАЗДЗЕЛ ІІ. Прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі ........ 25

Раздзел ІІІ. Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных прадметаў ........ 30

ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ........ 44

ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ ........ 48

ДАДАТКІ ........ 49

# УВОДЗІНЫ

Вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў V курса спецыяльнасці 1-23 01 12 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» прадугледжана вывучэнне дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі».

Пад час вывучэння курса студэнты павінны азнаёміцца з асноўнымі этапамі фарміравання кансервацыі і рэстаўрацыі, авалодаць асноўнымі паняццямі і тэрмінамі і ведаць асноўныя накірункі рэстаўрацыйнай дзейнасці, умець адрозніваць разнастайныя методыкі рэстаўрацыі. Акрамя гэтага, студэнты замацоўваюць веды, атрыманыя ў курсах «Тэорыя і методыка музейнай справы» і «Ахова і выкарыстанне помнікаў гісторыі і культуры». Вывучэнне дадзенай дысцыпліны накіравана на фарміраванне прафесійных якасцяў і навыкаў будучых спецыялістаў у галіне музейнай справы і дапаможа студэнтам у іх будучай прафесіянальнай дзейнасці.

Адзначаючы важнасць гэтага курсу трэба ўзгадаць слабую забяспечанасць літаратурай і навукова-метадычнымі матэрыяламі. З мэтай паляпшэння дадзенай сітуацыі і створаны вучэбна-метадычны дапаможнік «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі».

Матэрыялы дапаможніка могуць быць скарыстаны пры вывучэнні адпаведнага курса і падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў і заліку.

У склад дапаможніка ўключана праграма курса, кароткі канспект лекцый, планы семінарскіх заняткаў, спіс рэкамендаванай літаратуры, пытанні да заліку і дадаткі. У дадаткі ўключаны дакументы і нарматыўныя акты, звязаныя з рэстаўрацыйнай дзейнасцю, якія могуць быць скарыстаны для падрыхтоўкі да заняткаў і экзаменаў. У канспекце лекцый сцісла падаюцца асноўныя паняцці і тэрміны, гісторыя станаўлення рэстаўрацыі, асноўныя рэстаўрацыйныя тэорыі, прыводзяцца прыклады разнастайных рэстаўрацый. Шмат увагі нададзена рэстаўрацыі музейных прадметаў, як аднаму з галоўных накірункаў дзейнасці музея. Спіс літаратуры прапанаваны ў дапаможніку ўключае артыкулы і выданні па праблематыцы курса, якія можна знайсці ў бібліятэках г. Віцебска.

Аўтар выказвае шчырую падзяку за крытычныя заўвагі, парады, дапамогу і падтрымку шаноўнаму рэцэнзенту, загадчыку кафедры гісторыі Беларусі, кандыдату гістарычных навук, дацэнту Віктару Уладзіміравічу Акуневічу.



# ПРАГРАМА КУРСА «АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ»

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма курса «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі» складзена ў адпаведнасці з Адукацыйным стандартам. Вышэйшая адукацыя. Спецыяльнасць «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (РД РБ 02100.5.065-98).

Курс «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі» мае на мэце знаёмства студэнтаў з асноўнымі этапамі фарміравання кансервацыі і рэстаўрацыі як асобнага накірунку дзейнасці, асноўнымі паняццямі і тэрмінамі і асноўнымі напрамкамі рэстаўрацыйнай дзейнасці. Студэнты авалодваюць разнастайнымі методыкамі рэстаўрацыі, вывучаюць спецыфіку захавання і кансервацыі музейных прадметаў, замацоўваюць веды ў галіне навукова-фондавай работы, праектавання музейных экспазіцый і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры.

Для вывучэння курса прадугледжана 22 гадзіны лекцыйных і 14 гадзін семінарскіх заняткаў.

***Уводзіны.***

Мэты і задачы курсу. Асноўныя паняцці. Рэстаўрацыя, рэканструкцыя, рэгенерацыя. Розныя падыходы да рэстаўрацыі. Кансервацыя, вызначэнне паняцця.

***Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі.***

Стаўленне грамадства да помнікаў у розныя эпохі. Першыя рэстаўрацыі ў пачатку XIX ст. Стылістычныя рэстаўрацыі Віале ле Дзюка. Археалагічная рэстаўрацыя. Рэстаўрацыйныя тэорыі К. Бойто, Г. Джованноні, А. Рыгеля.

Рэстаўрацыйныя работы ў Расіі. Рэстаўрацыя ў Маскве, Кіеве, Уладзіміры. Вывучэнне помнікаў. Дзейнасць П. Пакрышкіна, В. Суслава і інш.

Рэстаўрацыя ў СССР. Рэстаўрацыйныя работы П. Бараноўскага, І. Грабара і стварэнне ЦРМ.

Рэстаўрацыя ў Сярэдняй Азіі. Б.Засыпкін. Аднаўленне помнікаў пасля II сусветнай вайны. Стварэнне рэстаўрацыйных майстэрань у савецкіх рэспубліках. Рэстаўрацыя архітэктурных помнікаў. Аднаўленне культавых пабудоў.

Вывучэнне архітэктурных помнікаў і рэстаўрацыя на Беларусі ў XIX – пач. XX стст. Рэстаўрацыя ў міжваенны перыяд. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў у Заходняй Беларусі. Стан архітэктурных помнікаў у БССР. Руйнаванне культавых пабудоў. Рэстаўрацыя ў пасляваенны час. Стварэнне спецыяльных рэспубліканскіх рэстаўрацыйных майстэрань. Аднаўленне

мемарыяльных пабудоў. Рэстаўрацыя гістарычных цэнтраў гарадоў. Стварэнне музеяў пад адкрытым небам. Даследаванні помнікаў дойлідства. Вядомыя рэстаўратары.

***Прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі.***

Міжнародныя дакументы па рэстаўрацыі і ахове помнікаў. Пакт Рэрыха. Афінская хартыя, Венецыянская хартыя. Хартыя аб ахове гістарычных гарадоў. Нацыянальныя заканадаўствы па ахове помнікаў.

Прынцыпы рэстаўрацыі. Віды рэстаўрацыйных работ. Даследаванні помнікаў падчас рэстаўрацыі. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні. Архіўна-бібліяграфічныя даследаванні. Вывучэнне помнікаў з дапамогай зандажоў. Фіксацыя помнікаў. Раскрыццё помніка. Рамонт. Аднаўленне. Фрагментарная і суцэльная рэстаўрацыя. Сігнацыя. Прыстасаванне. Дакументаванне рэстаўрацыйных работ. Анастылоз. Рэгенерацыя.

***Рэстаўрацыя музейных прадметаў.***

Рэстаўрацыйныя майстэрні. Патрабаванні да абсталявання. Рэстаўрацыйныя матэрыялы. Падрыхтоўка спецыялістаў рэстаўратараў.

Рэстаўрацыйны савет. Выбар методыкі рэстаўрацыі. Пашпарт рэстаўрацыі помніка (музейнага прадмета).

Рэстаўрацыя і кансервацыя жывапісу. Структура твораў жывапісу (аснова, палатно, фарбавы слой, ахоўны лак). Асноўныя віды пашкоджанняў. Даследаванне стану жывапісу. Простыя і тэхніка-тэхналагічныя даследаванні. Спосабы рэстаўрацыі і кансервацыі жывапісу. Рэжым захавання жывапісу.

Рэстаўрацыя і кансервацыя вырабаў з металу. Вырабы з чорных і каляровых металаў. Спосабы ачысткі металічных рэчаў. Кансервацыя археалагічнага жалеза. Матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца падчас кансервацыі. Рэстаўрацыя зброі. Асноўныя пашкоджанні металаў. Віды карозіі. Захаванне нумізматычных калекцый. Ачыстка і кансервацыя манет. Рэжым захавання металічных вырабаў.

Рэстаўрацыя керамікі і шкла. Гісторыя стварэння керамікі. Асноўныя віды керамікі. Фаянс і фарфор. Палявая апрацоўка археалагічнай керамікі. Замацаванне. Рэстаўрацыя і кансервацыя керамічных вырабаў. Матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры рэстаўрацыі. Вырабы са шкла. Спосабы захавання і рэстаўрацыі.

Рэстаўрацыя прадметаў з дрэва. Метады даследавання. Прычыны пашкоджанняў. Матэрыялы, выкарыстоўваемыя для кансервацыі. Асноўныя патрабаванні. Рэстаўрацыя вырабаў з дрэва. Захаванне і ахова помнікаў драўлянага дойлідства.

Рэстаўрацыя дакументальных помнікаў. Асноўныя віды матэрыялаў для дакументальных помнікаў: папера, пергамент. Пашкоджанні дакументальных помнікаў. Спосабы рэстаўрацыі. Рэжым захавання. Кансервацыя і рэстаўрацыя рукапісных грамат. Асаблівасці рэстаўрацыі пячатак. Выкарыстоўваемыя матэрыялы. Адбельванне паперы.



***Літаратура***


1. Багласаў С.Г. Верхний город Минска: проблемы реконструкции // Строительство и архитектура Беларуси. – 1982. – № 2.
2. Багласаў С.Г. Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. – Мн., 1984.
3. Бекцінееў Ш. Чыстка і кансервацыя музейных і калекцыйных дробных металічных экспанатаў // БГЧ. – № 4. – 1997. – С. 116–118.
4. Беляев Л.А. Проведение археологических исследований при реставрации памятников архитектуры. – М., 1991.
5. Венецыянская хартыя // Наша ніва. – 1994. – № 8–9.
6. Выгонная А.А. Основы реставрации памятников архитектуры, монументальной и станковой живописи: Уч. пособие / Под ред. Г.П. Жаровиной. – М., 2000.
7. Грейм Гардинер. Консервационное обследование: постановка проблем, связанных с обеспечением сохранности // Междунар. журн. «Museum» (ЮНЕСКО). – 1996. – № 190. – С. 55–58.
8. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. – Мн., 1984–1988.
9. Іканапіс Беларусі 15-18 стст. / Склад. Н.Ф. Высоцкая. – Мн., 1994.
10. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / В.Ф. Шматаў. – Мн., 2002.
11. Кисель В.П. Памятники всемирного наследия. – Мн., 2000.
12. Кодекс профессиональной этики / Междунар. совет музеев (ICOM). – Б.м., б.г. – 34 с.
13. Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по вопросам охраны культурного наследия: Сб. документов. – М., 1990.
14. Консервация и реставрация книг: Методические рекомендации. – М., 1987.
15. Консервация и реставрация музейных ценностей: Объекты на бумаге и пергаменте. Материалы конференции // Труды ГИМ. – М., 2002. – Вып. 129.
16. Кроллау Е.К. Температурно-влажностный и световой режим музеев. – М., 1971.
17. Кулагін А.М. Архітэктурная культура праваслаўя на Беларусі: Помнікі культавага дойлідства на Беларусі // Каштоўнасці мінуўшчыны-3. – Мн., 2000.
18. Матэрыялы ІІ Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. – Полацк, 1996.
19. Международная хартия по консервации и реставрации памятников и достопримечательных мест (Венеция, 1964) // Архитектура СССР. – 1990. – № 4. – С 22–23.
20. Международные нормативные документы по реставрационной этике / В.Г. Белозерова– М., 1990.
21. Консервация и реставрация музейных худож. ценностей. Экспресс-информ. / Гос. б-ка СССР им. В.И. Ленина. – Вып. 6.

22. Методика и технология консервации и реставрации памятников истории и культуры: Сб. науч. трудов. – М., 1988.
23. Методика реставрации памятников архитектуры: Пособие для архитекторов-реставраторов. – М., 1961,
24. Никитин М.К., Мельникова Е.П. Химия в реставрации: Справ. пособие. – Л., 1990.
25. Подъяпольский С.С. Реставрация памятников архитектуры. – М., 1986.
26. Реставраторам и хранителям библиотечных фондов: Методические рекомендации / Гос. биб-ка СССР им. В.И. Ленина, отд. гигиены и реставр. [Сост. Бурцева и др.]. – М., 1981.
27. Реставрация древнерусской живописи в СССР 1917–1977. – М., 1978.
28. Реставрация и исследование художественных памятников: Сборник статей. – М., 1955.
29. Реставрация музейных коллекций: Двадцатилетие деятельности ВЦ НИЛКР / в НИИ реставрации. – М., 1979.
30. Реставрация музейных ценностей в СССР. Сб статей. – М., 1982.
31. Реставрация музейных ценностей в СССР: Всесоюзная выставка: Проспект. – М., 1984.
32. Реставрация музейных ценностей: Научные и практические работы // Труды ГИМ. – М., 1999. – Вып. 107.
33. Реставрация памятников архитектуры: Учеб. пособие для вузов / С.С. Подъяпольский, Г.Б. Бесанов, Л.А. Беляев и др. / Под ред. С.С. Подъяпольского. – 2-е изд. – М., 2000.
34. Реставрация произведений станковой масляной живописи: Уч. пособие для сред. худ. заведений / И.П. Горин, И.П. Суворов, Э.В.Черкасова и др.; Науч. ред. И.П. Горин, Э.В. Черкасова. – М., 1977.
35. Реставрация станковой темперной живописи: Уч. пособие для реставр. отд-ний худ. училищ / Г.А. Богданов, Е.М. Кристи, В.В. Филатов, С.В. Филатов; под ред. В.В. Филатова. – М., 1986.
36. Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных каштоўнасцей: праблемы і метады іх вырашэння / Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі 23–24 лістапада 1999 г., Мінск. – Мн., 2000.
37. Сычёв А.В. Охрана природы и архитектуры: градостроительные аспекты рационального использования ландшафта Белоруссии. – Мн., 1978.
38. Черепица В.Н. Гродненский православный некрополь. – Гродно, 2001.
39. Шепелев Л.Е. Архивные разыскания и исследования. – М., 1971.
40. Школа музейных кансерватараў. Бытавая кераміка, этнаграфічны тэкстыль: Навукова-метадычныя матэрыялы / Укл. А.Б. Сташкевіч. – Мн., 2005.



# УВОДЗІНЫ

*Рэстаўрацыя* (ад лацінскага restauratio – аднаўленне) – комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне помніка гісторыі і культуры ці твора мастацтва, выяўленне яго мастацкіх вартасцей і грамадскай каштоўнасці.

З'яўленне рэстаўрацыйнай дзейнасці было звязана з узрастаннем цікавасці да гісторыі і помнікаў мінулага. Да XIX ст. рэстаўрацыя не з'яўлялася асаблівым відам мастацтва ці рамяства. «Рамонтам», «панаўленнем», «аднаўленнем» старажытных пабудоў займаліся будаўнікі ці архітэктары, абразоў і карцін – іканапісцы і мастакі.

Упершыню тэрмін «рэстаўрацыя» быў ужыты ў рускай мове ў 1834 г. З таго часу гэтае вызначэнне як і вызначэнне «рэстаўрацыйны працэс» шмат разоў змянілася ў сувязі з адносінамі грамадства да помнікаў у кожны канкрэтны перыяд. У XIX ст. пад мэтай рэстаўрацыі разумелася ўзнаўленне старажытнага помніка ў яго «першапачатковым выглядзе», аднаўленне ў суадносінах з тагачаснымі моднымі тэндэнцыямі і густам заказчыка.

Такая рэстаўрацыя вызвала крытыку грамадства. У пачатку XX ст. узнікае так званая «навуковая рэстаўрацыя», якая ўключала гістарычныя пошукі, даследаванне тэхнічнага стану помніка, дакументаванне рэстаўрацыйнага працэса.

Пасля II сусветнай вайны з'яўляецца тэндэнцыя агульнай рэканструкцыі помнікаў (знішчаных у вайну). Прымаюцца міжнародныя дакументы па рэстаўрацыі. Пачынаецца падрыхтоўка адпаведных спецыялістаў-рэстаўратараў (глядзі дадатак).

У міжнародным маштабе няма адзінага падыходу да рэстаўрацыі, існуе шэраг нацыянальных школ рэстаўрацыі. Найбольш распрацавана праблема тэорыі рэстаўрацыі, шмат практычных і даследчых работ, і арганізаваны навучальныя цэнтры па падрыхтоўцы спецыялістаў у Італіі, добра арганізавана рэстаўрацыя і ахова помнікаў у Францыі і Германіі.

У архітэктурнай рэстаўрацыі прызнаюцца тры рэстаўрацыйныя метады:

– *метад кансервацыі* дазваляе захаваць помнік і гістарычныя наслаенні, якія з'явіліся пад час яго існавання;

– *аналітычны метад* разглядае помнік як гістарычную крыніцу і характарызуецца выкарыстаннем беражлівых сродкаў без унясення новага ў помнік. Аналітычны метад выкарыстоўваў Г. Джавапоні, італьянскі архітэктар К. Бойто, мастак А. Рыгель;

– пры *сінтэтычным метадзе* рэстаўрацыі асноўная мэта – цэласнае ўзнаўленне помніка ў яго першапачатковым выглядзе пры дапамозе аналогій і гіпотэз. Прадстаўнікі Віале-ле-Дзюк у Францыі, Ф. Рыхтэр у Расіі.

Асноўныя віды рэстаўрацыйных работ, праводзімых на помніках архітэктуры, наступныя:

*Рамонт* – комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне тэхнічнага стану аб'екта без унясення змен у канструкцыйнае і эстэтычнае вырашэнне.

*Натурныя даследаванні* – комплекс мерапрыемстваў па высвятленню і ўдакладненню якасцей і асаблівасцей аб'екта.

*Кансервацыя* – комплекс мерапрыемстваў часоваму ці доўгатэрміноваму забеспячэнню захаванасці наяўнага стану аб'екта.

*Рэстаўрацыя* – комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на аднаўленне цэласнасці існуючага агульнага кампазіцыйнага вырашэння аб'ектаў (у асноўным комплексных).

*Рэканструкцыя* – комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнні тэхнічнага стану і функцыянальных вартасцей аб'ектаў з дапушчэннем частковых змен канструкцыйных і неістотных фізічных асаблівасцей аб'екта.

*Аднаўленне* – навукова абгрунтаванае поўнае ці частковае паўторнае стварэнне аб'ектаў (для нерухомых матэрыяльных каштоўнасцей); абавязкова на месцы іх папярэдняга існавання.

*Прыстасаванне* – комплекс мерапрыемстваў па адаптацыі аб'ектаў да сучасных патрэб і асаблівасцей сучаснага тэхнічнага ўтрымання.

*Дапаўненне* – комплекс мерапрыемстваў па ўтварэнні нанава ўводзімых дапаўненняў да аб'екта, у тым ліку і па завяршэнню своечасова нерэалізаваных аўтарскіх задум (для помнікаў XVIII–XIX стст.).

*Раскрыццё* – комплекс мерапрыемстваў па пазбаўленні каштоўнасці позніх дэсаніруючых напластаванняў.

У асобную галіну вылучылася *рэстаўрацыя твораў мастацтва і музейных прадметаў.* Рэстаўрацыя музейных прадметаў складаецца з:

1) правядзення аналітычнага даследавання помніка;
2) кансервацыі;
3) раскрыцця;
4) захоўвання і назірання.

Перад выкананнем рэстаўрацыйных работ (незалежна ад віду помніка) праводзяцца рознабаковыя навуковыя даследаванні, мэта якіх – выяўленне сапраўднай структуры помніка, вызначэнне аўтарства, тэхнікі выканання, захаванасці, пашкоджанасці, наслаенняў і выпрацоўка аптымальных умоў існавання помніка. Разам з гісторыка-архіўным і мастацтвазнаўчым вывучэннем звестак аб прадмеце, выкарыстоўваюць метадычныя распрацоўкі сумежных навуковых дысцыплін (фізікі, хіміі, біялогіі і г.д.), з дапамогай розных прыбораў і прыстасаванняў даследуецца мікраструктура помніка (рэнгенаграфічны і ультрапромневыя даследаванні). Усё гэта фіксуецца па ўстаноўленаму ўзору. На выснове даследаванняў распрацоўваецца методыка рэстаўрацыі помніка. Гэты комплекс даследванняў праводзіць калектыў розных спецыялістаў разам з выканаўцамі рэстаўратарамі.



*Рэстаўрацыйная методыка* – праграмы для правядзення працэсу рэстаўрацый з указаннем мэты рэстаўрацыі, відаў работ і іх паслядоўнасці, выкарыстання рэстаўрацыйных матэрыялаў, інструментаў, абсталявання. Напрыклад, рэстаўрацыя станкавага жывапісу складаецца з наступных аперацый:

1) антысептыраванне;
2) умацаванне асновы, грунта, фарбавага слоя;
3) ачышчэнне паверхнявых забруджванняў, аліфы, запісаў;
4) узнаўленне грунта;
5) нанясенне ахоўнага пакрыцця (лак).

Увесь рэстаўрацыйны працэс дакументуецца і фіксуецца, на аснове гэтай інфармацыі складаецца рэстаўрацыйны пашпарт прадмета. Рэстаўрацыйны працэс вядзецца пад наглядам рэстаўрацыйнага савета ці камісіі. Савет вырашае, якая будзе выкарыстоўвацца рэстаўрацыйная методыка да кожнага помніка, кантралюе яе выкананне і вырашае, якія будуць выкарыстаны матэрыялы. Савет можа прыпыніць працу рэстаўратара, калі не задаволены працэсам рэстаўрацыі.

Існуюць дзве супрацьлеглыя пазіцыі ў тлумачэнні рэстаўрацыйнага працэсу. З пункту гледжання навуковай рэстаўрацыі, галоўная мэта – захаванне і прадленне жыцця помніка, комплекснае навуковае даследаванне, раскрыццё подлінасці помніка і выяўленне яго гістарычнай, мастацкай і мемарыяльнай значнасці. Супрацьлеглая пазіцыя – паказаць у помніку яго мастацка-эстэтычныя каштоўнасці, таму галоўная мэта рэстаўрацыі – ўзнаўленне «першавобраза», рэканструкцыя страчаных элементаў, прыданне помніку экспазіцыйнага выгляду.

*Кансервацыя* – ад лацінскага conservation – што азначае захаванне – гэта сукупнасць мер, накіраваных на стабілізацыю фізічнага стану помніка, іх долгатэрміновую ахову ад уздзеяння вільгаці, тэмпературы, святла і механічных пашкоджанняў, забеспячэнне іх захаванасці ў непасрэдных умовах існавання.

Сучасная кансервацыя мае *два аспекты*:

1) кансервацыя разглядаецца як этап рэстаўрацыі, калі забяспечваецца захаванасць матэрыяльнай асновы помніка;

2) кансервацыя – гэта разнастайныя ахоўныя мерапрыемствы на ўсіх стадыях рэстаўрацыйнага працэса.

Як этап рэстаўрацыі, кансервацыя звязана з папярэднім навуковым даследаваннем помніка і з'яўляецца комплексам аперацый, якія праводзяцца дзеля прадухілення разбурэння помніка, ці стабілізацыі яго стану. У архітэктуры кансервацыйныя мерапрыемствы – гэта і мерапрыемствы па часовай ахове помніка, якія знаходзяцца ў небяспечным стане (усталяванне падпорак, навесаў і г.д.); складаныя спецыяльныя аперацыі, якія патрабуюць папярэдніх інжынерна-тэхналагічных, архітэктурных і археалагічных даследаванняў (умацаванне фундамента, нясучых канструкцый,

выпраўленне дэфармацый і г.д.); мерапрыемствы, звязаныя з арганізацыяй рэжыму існавання і захавання помніка.

У залежнасці ад мэтавай накіраванасці *кансервацыя* можа быць *аварыйнай ці экстранай* (напрыклад, тэрміновая апрацоўка пры выкрыцці біяпашкоджанняў тканіны), *прафілактычная ці першапачатковая* (паступленне прадмета ў музей), звязаная з захаваннем раскрытых помнікаў (пакрыццё лакам жывапісу), *паўторная* кансервацыя. Адзін са спецыфічных відаў кансервацыі – *палявая*, якая выкарыстоўваецца падчас археалагічных даследаванняў. Таксама спецыфічны від кансервацыі – *кансервацыя руін*, выкарыстоўваецца і для помнікаў археалогіі.

З 1960-х гг. выкарыстоўваецца тэрмін «кансервацыя і рэстаўрацыя», і гэты варыянт уключаны ў «Венецыянскую хартыю» (дадатак).

## РАЗДЗЕЛ І. ФАРМІРАВАННЕ ПРЫНЦЫПАЎ СУЧАСНАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ. ГІСТОРЫЯ РЭСТАЎРАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### § 1. Рэстаўрацыя ў Заходняй Еўропе ў XIX – пачатку XX ст.

Архітэктурныя збудаванні заўседы былі прадметам турбот. Іх падтрымлівалі, рамантавалі, узнаўлялі. Часцей за ўсё гэта дыктавалася нейкімі утылітарнымі патрэбамі. З цягам часу старыя будынкі разбураліся, ці часткава выкарыстоўваліся пры будаўніцтве новых будынкаў. Ужо ў познеантычны перыяд розныя часткі будынкаў пераносілі з аднаго збудавання ў другое (калоны, гарэльефы). Майстры сярэднявечча выкарыстоўвалі дэталі антычных будынкаў пры будаўніцтве хрысціянскіх цэркваў. Пазней гатычныя майстры перабудоўвалі раманскія пабудовы. Таксама перарабляліся будынкі ў часы Рэнесанса і барока. Вельмі рэдка будынкі рабіліся ў стылі ранейшай эпохі. Напрыклад, царква Сан-Петроніо ў Балоны закладзена ў 1390 г., скончана ў XVI–XVII стст. у гатычных формах. Паўплываў густ заказчыка. Адносіны да архітэктурных твораў як да помнікаў – з Рэнесанса.

З XV ст. вывучаюць антычныя будынкі, спрабуюць рабіць падобныя, абмяраюць, замалёўваюць. Але ж амаль да XVII ст. ідзе разбурэнне помнікаў Антычнасці. Напрыклад, Калізей выкарыстоўваўся як каменаломня для многіх будынкаў Рыма.

Стаўленне да антычных помнікаў змяняецца ў XVIII ст., што звязана з развіццём навук. Праводзяцца першыя археалагічныя раскопкі: 1738 г. – Геркуланум. 1748 г. – Пампеі. З'яўляюцца навуковыя таварыствы, якія займаліся вывучэннем помнікаў антычнасці.

У пачатку XIX ст. праводзіцца рэстаўрацыя Калізея (архітэктар Рафаэль Стэрн). Знешняе кальцо сценак амфітэатра было ўмацавана прыбудаванымі цаглянымі контрафорсамі.



Найбольш значнае месца сярод першых рэстаўратараў займае Дж. Валадзье, які правёў рэстаўрацыю аркі Ціта у Рыме ў 1821 г. Ён разабраў больш позні муроўкі і наслаенні, выявіўшы ўсе рэшткі помніка антычнага перыяду і аднавіў першапачатковы выгляд помніка. Усе новыя часткі ён вылучыў: па-першае, яны не з мармура, а з траверціна, па-другое, больш спрошчаныя, без дэкору.

У гэты час узнікае інтарэс да помнікаў Сярэднявечча. У розных краінах пачынаецца вывучэнне і спробы аднаўлення помнікаў Сярэднявечча. Найбольшая ўвага надавалася гатычным помнікам. Аднак яшчэ не былі выпрацаваны прынцыпы рэстаўрацыі, і ўсё залежала ад густу архітэктара. У Англіі было прынята ўносіць «паляпшэнні» пры рэстаўрацыі будынкаў у стылі готыкі.

У Францыі работы зводзіліся да мерапрыемстваў па ўмацаванні (усталяванне падпорак, замуроўка праёмаў) ці дабудове частак, асабліва любілі дабудоўваць шпілі сабораў.

Вялікая заслуга ў развіцці рэстаўрацыі належыць французскаму архітэктару і мастацтвазнаўцу Эжэну Эмануэлю Віале-ле-Дзюку. Ён займаўся рэстаўрацыяй і вывучэннем помнікаў сярэднявечча. Першая рэстаўрацыйная работа – царква Сент Мадэлен у Вэзле, гэта была раманская пабудова з гатычнымі дабаўленнямі. Пры рэстаўрацыі ле Дзюк убраў гатычныя элементы, пакінуўшы толькі больш раннія раманскія і ўзнавіў царкву ў раманскім стылі.

Наступнай рэстаўрацыйнай работай стала рэстаўрацыя Сабору Парыжскай Багамацеры. Былі перароблены вокны XIII ст. на вокны ў формах XII ст., занава адноўлены скульптуры галоўнага партала. Самастойна ле Дзюк аднавіў статуі хімер, якія не захаваліся. Узнаўляючы шпіль над трансэптам, упрыгожыў яго выявамі сябе і сваіх памочнікаў.

Пасля гэтага займаўся рэстаўрацыяй французскіх замкаў, адрэстаўраваў шмат аб'ектаў. Асабліва вылучаецца аднаўленне ўмацаванняў г. Каркасон і замка П'ерфон.

Ён канчаткова сфармуляваў тэарытычныя пазіцыі сваёй рэстаўрацыі (стылістычная ці рамантычная рэстаўрацыя). Асноўны прынцып такой рэстаўрацыі: узнаўленне будынкаў у першапачатковым выглядзе, стылістычна адзіным без розных напластаванняў. Усе пашкоджаныя элементы выдаляліся і замяняліся копіямі.

Стылістыстычная рэстаўрацыя распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе, і ў многіх краінах пачалі праводзіцца аднаўленні архітэктурных помнікаў.

Многім не падабалася такая рэстаўрацыя. Усё павінна аднаўляцца так як было неабходна даследаваць помнік. Менавіта такія даследаванні праводзіліся перад рэстаўрацыяй замка Сфорца ў Мілане пад кіраўніцтвам Лукі Бельтрамі.

Італьянскі архітэктар і тэарэтык Каміло Бойто актыўна выступаў супраць стылістычнай рэстаўрацыі. Ён прапанаваў новыя прынцыпы: стылістычныя адрозненні паміж новым і сапраўдным, і розніца ў матэрыяле;

адмаўленне ў новых частках ад арнаментыкі; маркіроўка новых уключэнняў спецыяльнымі знакамі і надпісамі і ўстаноўка дошкі аб правядзенні рэстаўрацыі; складанне вопісу этапаў рэстаўрацыі; галоснасць прымаемых рашэнняў. Распрацаваў класіфікацыю рэстаўрацыі, падзяліў яе на:

- археалагічную рэстаўрацыю;
- жывапісную рэстаўрацыю;
- архітэктурную рэстаўрацыю.

Далейшае развіццё ідэй Бойто у працах аўстрыйца Алоіза Рыгеля. Ён вылучае гістарычны аспект у рэстаўрацыі: захаванне пазнейшых наслаенняў, слядоў старэння (паціна часу), разбурэнняў.

Новыя прынцыпы з пачатку XX ст. Узнікае так званая «археалагічная рэстаўрацыя», вакол помніка і на самім помніку абавязкова праводзяца археалагічныя даследаванні. Адзін з тэарэтыкаў археалагічнай рэстаўрацыі К. Джаваноні прапанаваў падзяляць рэстаўрацыю на 5 работ: умацаванне, анастылоз, раскрыццё, дапаўненне, аднаўленне.

Усе новыя прынцыпы былі ўнесены ў «Афінскую хартыю», прынятую ў 1931 г. (глядзі дадатак).

Пасля другой сусветнай вайны ўстае праблема ўзнаўлення помнікаў з руін, гэтая праблема ўжо ўздымалася пасля першай суствeтнай вайны, калі былі пашкоджаны шматлікія помнікі асабліва ў Францыі і Бельгіі. Узнікла палеміка, ці будзе правільным аднаўляць страчанае. Многія дзеячы культуры, як напрыклад, скульптар Радэн, паэт Растан – пратэставалі супраць спроб аднавіць помнікі і прапаноўвалі захаваць руіны, як сведкі чалавечага варварства. Аднак тэхнічныя магчымасці рэстаўрацыі аказаліся больш дасканалымі, чым лічылася да гэтага, і былі праведзены шматлікія рэстаўрацыі зруйнаваных помнікаў. Напрыклад, разбітыя скульптуры Рэймскага сабора былі ўзноўлены (склеены) з абломкаў і амаль поўнасцю адноўлены без замены новымі копіямі.

Найбольш вялікія страты архітэктурнай спадчыны панеслі СССР і Польшча. Былі разбураны цэлыя гарады, гаворка ішла ўжо не аб знікненні асобных помнікаў, а аб магчымасці знікнення сведчанняў існавання нацыянальнай культуры (як у выпадку з гістарычным цэнтрам Варшавы). Прынцыпы адносін да архітэктурнай спадчыны, выпрацаваныя на практыцы рэстаўрацыі асобных будынкаў, трэба было суадносіць з новай сітуацыяй. І практыка і прапановы па поваду ўзнаўлення помнікаў былі рознымі. Найбольш блізкім да прынцыпаў археалагічнай рэстаўрацыі можна лічыць вырашэнне па рэстаўрацыі сабора ў Ковентры (Велікабрытанія). Сабор быў поўнасцю разбураны падчас налётаў нямецкай авіяцыі. Рэшткі сабора былі закансерваваны, а сабор зроблены з новых матэрыялаў на іншым месцы. Але гэты выпадак хутчэй выключэнне з агульных тэндэнцый, што панавалі ў гэты час у Еўропе. Нават моцна разбураныя помнікі стараліся поўнасцю ўзнавіць. Напрыклад, у паўночнай Італіі былі ўзноўлены ўсе масты, узарваныя падчас ваенных дзеянняў.



## § 2. Рэстаўрацыя ў Расіі і СССР

Першыя спробы – адбудова Георгіеўскага храма (г. Юр'еў-Польскі) у 1471 годзе, архітэктар – В. Ярмолін.

У XVIII ст. Архітэктар В. Бажэнаў распрацаваў новы праект Крамля, па якім стары знішчаўся (Масква). Грамадства было супраць, і Крэмль пакінулі. Кацярына II загадала аднавіць вежы Крамля. У час вайны з Напалеонам Масква была спалена, над яе аднаўленнем пачалі працаваць лепшыя архітэктары.

У XIX ст. упершыню сталі вывучаць рускую абарончую архітэктуру – крамлі.

Сярэдзіна XIX ст. – вялікую ролю адыгрываюць рускія археолагі з Рускага імператарскага археалагічнага таварыства.

З 1889 г. створана імператарская камісія (да 1917 г. – галоўны навуковы орган Расіі па ахове помнікаў).

Маскоўскае археалагічнае таварыства – 1864 г.

Па загаду Мікалая I (1834–1834 гг.) была праведзена рэстаўрацыя Дзмітрыеўскага сабора ва Уладзіміры. Архітэктар Е. Пятроў. Рэстаўрацыя была зроблена няўдала.

Першыя спробы археалагічнай рэстаўрацыі – раскопкі і ўмацаванне Залатой брамы у г. Кіеве (архітэктар А. Бярэцці) і рэстаўрацыя палат Раманавых у Маскве, 1858 г. (архітэктар – Ф. Рыхтар).

Рыхтар упершыню зрабіў архітэктурныя абмеры. Былі адноўлены абарончыя збудаванні ў Каломне (архітэктар А. Паўлінаў). Рэстаўрацыя Успенскага сабора ва Уладзіміры (архітэктар М. Карыцкі), выклікала шмат увагі грамадскасці, усе вынікі рэстаўрацыі былі надрукаваны археалагічным таварыствам.

Да 1900 г.– рэстаўратар В. Суслаў аднавіў Наўгародскую Сафію.

Новыя метады рэстаўрацыі распрацаваў П. Пакрышкін: аднавіў царкву Спаса на Нярэдзіцы ў Наўгародзе (1902–1908) і выдаў падручнік па рэстаўрацыі «Краткие советы по ремонту памятников старины и искусства» – (1916 г.)

Акадэмік А. Шчусеў аднавіў царкву Васіля ў г. Оўруч (1908–1910 гг.) Адноўлены верхнія часткі храма.

Кіеў – царква Спаса на Бяроставе – 1909–1913 гг. (П. Пакрышкін) Перабудавана ў стылі ўкраінскага барока, і сцены атынкаваны.

У пачатку XX ст. налічвалася ўжо даволі значная колькасць даследчыкаў расійскага дойлідства, многія з іх займаліся рэстаўрацыяй. Трэба назваць Ф. Гарнастаева, Д. Мілеева, І. Рыльскага, Д. Сухава. Да гэтага часу ў Расіі ўжо склалася свая рэстаўрацыйная школа, сістэма поглядаў якой суадносілася з еўрапейскім узроўнем.

Працы гэтай школы сталі базай, за якой пачалася рэстаўрацыя ў савецкі перыяд. Працаваць прыходзілася ў вельмі складаных умовах. Не-

дахоп сродкаў, неразуменне з боку новай улады, якое з цягам часу перайшло ў адкрытую варожасць. Усё гэта ўскладняла працу па рэстаўрацыі. Але ў 20-я гады рэстаўрацыйныя работы мелі ўжо даволі значныя маштабы.

Рэстаўрацыя помнікаў Крамля (І. Рыльскі, Д. Сухаў, Н. Вінаградаў, М. Памеранцаў), сабор Пакрова на Ірве (Д. Сухаў), сцены і вежы Кітай-горада (Н. Вінаградаў).

Вялікія работы былі праведзены Пятром Бараноўскім (рэстаўрацыя палат Галіцына ў Ахотным радзе, Казанскі сабор на Чырвонай плошчы, Болдзін манастыр пад Дарагабужам і інш.).

У гэты час пачалася рэстаўрацыя помнікаў Сярэдняй Азіі, якой кіраваў Б. Засыпкін.

Усе рэстаўрацыйныя работы ў 1920-я гг. вылучаюцца паўнатой і дасканаласцю вывучэння, абгрунтаванасцю рэстаўрацыйных вырашэнняў, часта зведзеных да рэстаўрацыі фрагментарнай.

Даволі значны маштаб рэстаўрацыйных дабаўленняў характаразуе работы П. Бараноўскага. У некаторых выпадках, як напрыклад з палатамі Галіцына, была поўнасцю адноўлена фасадная дэкарацыя. Аднаўлялася яна з рэдкай дакладнасцю і дакументаванасцю, дзякуючы метаду развярстоўкі муроўкі па хваставых частках цэглы, застаўшайся ў сценцы. Гэты метад быў прапанаваны П. Бараноўскім упершыню.

Вялікую ролю ў станаўленні навуковых прынцыпаў рэстаўрацыі адыграла стварэнне Цэнтральных дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрань, якія ўзначаліў І. Грабар у 1924 г. Філіялы былі ў Ленінградзе і Яраслаўлі. Майстэрні выконвалі рэстаўрацыю архітэктуры, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Гэта супадала з поглядамі І. Грабара аб адзінстве прынцыпаў рэстаўрацыі для ўсіх катэгорый помнікаў. Свае погляды ён сфармуляваў у лекцыях па рэстаўрацыі, якія прачытаў ў 1927 г. у МДУ. У іх ён таксама не падзяляў рэстаўрацыю архітэктурных і іншых відаў мастацтва, а спецыфіка работ па розных тыпах аб'ектаў устанаўліваецца на стадыі апісання тэхнічных прыёмаў рэстаўрацыі. Рэстаўрацыя ўваходзіць у паняцце кансервацыя, пад якім ён разумеў сукупнасць мер, накіраваных на паляпшэнне ўмоў захавання помніка. У рэстаўрацыі *два асноўных моманта*: раскрыццё і ўзнаўленне, прычым першае больш пераважнае пры ўмове, што не руйнуецца нічога мастацка ці гістарычна каштоўнага. Любая рэстаўрацыя павінна праводзіцца па неабходнасці, а не дзеля самой рэстаўрацыі. І. Грабар лічыў неабходным абазначаць новыя ўключэнні ў помнік, яны павінны адрозніваца ад сапраўдных, але быць з падобных матэрыялаў, каб пазбегнуць эфекту несумяшчэння матэрыялу.

Важныя заўвагі па пытанні рэстаўрацыі належаць Б. Засыпкіну. Асаблівую ўвагу ён надае пытанням археалагічна-архітэктурнага даследавання помнікаў. Праграма такога вывучэння даволі вялікая і акрамя фіксацыі гэта тэхнічнае і тэхналагічнае даследаванне, вывучэнне канструкцый, архітэктурных форм, дэкору, выяўленне старажытных частак, раскрыццё і аналіз атрыманых матэрыялаў. Сінтэзам з'яўляецца рэканструкцыя помніка і яго рэстаўрацыя (пад рэканструкцыяй разумеў частковую ці фрагментальную рэканструкцыю).



Пазіцыя І. Грабара і Б. Засыпкіна мацавалася на паслядоўным правядзенні прынцыпаў археалагічнай рэстаўрацыі. Рэстаўрацыя помнікаў у СССР у гэты перыяд была на адным узроўні з рэстаўрацыяй у перадавых краінах Еўропы.

Спачатку 30-х гг. усе рэстаўрацыйныя работы былі прыпынены, і пачалося сістэматычнае знішчэнне помнікаў, нават адрэстаўраваных (сабор Хрыста Збавіцеля, Сухарава вежа і інш.). У 1937 г. зачыняюцца Цэнтральныя дзяржаўныя рэстаўрацыйныя майстэрні. Вялікія страты помнікам нанесла Другая сусветная вайна.

Вялікія страты, панесеныя падчас вайны, прывялі да пераацэнкі каштоўнасцей у СССР. У 1948 г. прымаецца ўрадавае пастанаўленне аб ахове помнікаў, і ствараецца сетка рэстаўрацыйных майстэрань ва ўсіх рэспубліках (на Беларусі толькі ў 1960-я гг.). Вядзецца ўзнаўленне разбураных комплексаў, амаль з «нуля» былі адноўлены палацава-паркавыя ансамблі прыгарадаў Ленінграда. Нанава адноўлена царква Спаса на Нярэдзіцы ў Ноўгарадзе, падчас рэстаўрацыі былі выкарыстаны матэрыялы і абмеры першай рэстаўрацыі гэтага помніка.

## § 3. Ахова і рэстаўрацыя помнікаў на Беларусі

Заканадаўчыя нормы ў галіне рэстаўрацыі і аховы помнікаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, узыходзяць вытокамі да перыяду яе ўваходжання ў склад Расійскай імперыі. 31 снежня 1826 г. Мікалаем І быў выдадзены Указ «Аб прадастаўленні звестак аб рэштках старажытных будынкаў у гарадах і забароне іх руйнаваць». Указ не прадугледжваў правядзення рамонтных прац. 3 кастрычніка 1857 г. Міністэрства ўнутраных спраў загадала Віцебскаму губернатару прадставіць звесткі аб усіх старажытных будынках у губерні. У выніку з'явіліся паведамленні аб доміку Пятра І у Полацку, пабудовах Спаса-Ефрасіньеўскага і Барысаглебскага манастыроў.

У выніку войнаў XVII–XVIII стст. на тэрыторыі Беларусі найбольш пацярпелі замкавыя будынкі. Падчас паходу Карла XII былі разбураныя замкі ў Любчы, Гераненах, Крэве, Гальшанах і іншых гарадах і мястэчках. У пачатку XIX ст. іх руіны сталі крыніцай будаўнічага матэрыялу.

У 1881 годзе выдаецца яшчэ адзін Указ аб ахове старажытнасцяў. Працы ў дадзенай вобласці актывізаваліся пры садзейнічанні навуковых таварыстваў. У выніку іх хадайніцтва ў 1897 году быў выдадзены ўказ, забараняўшы перабудову старажытных будынкаў без дазволу археалагічных таварыстваў. Адначасова Сінод выдае адпаведныя ўказанні

адносна рамонту старажытных храмаў. 11 сакавіка 1889 г. нагляд за захаваннем помнікаў і іх рэстаўрацыяй перадаецца Імператарскай археалагічнай камісіі і Акадэміі мастацтваў. З 1891 года на рэгулярных паседжаннях разглядалася да сотні помнікаў у год. У асноўным гэта былі царкоўныя будынкі еўрапейскай часткі Расійскай імперыі.

Першымі помнікамі на тэрыторыі Беларусі, разгледжанымі Імператарскай археалагічнай камісіяй, былі Каложская царква ў Гародні і Белая вежа. Стан Каложскай царквы абмяркоўваўся ў 1896 і 1904 гг., Белай вежы – у 1898 і 1902 гг. У 1909 годзе Сінод стварае камісію па рэстаўрацыі Каложскай царквы. У 1914 годзе архітэктар П. Пакрышкін прадставіў у Сінод праект рэстаўрацыі царквы, які не быў рэалізаваны. У 1905–1907 гг. Імператарская археалагічная камісія абмяркоўвала стан Лідскага замка, які мясцовыя жыхары спрабавалі ўмацаваць уласнымі сіламі.

Больш усяго спраў камісіі прыходзілася рашаць у сувязі з епархіяльнымі прашэннямі аб рамонтах цэркваў. У 1913 годзе быў дадзен дазвол на рамонт Успенскага сабора ў Віцебску (1743–1777 гг.). У 1913 годзе камісія выдае дазволы на рамонт Васкрасенскай і Багаяўленскай цэркваў у Віцебску з умовай недатыкальных адносін да роспісаў.

У 1913 годзе П. Пакрышкін кіруе рамонтам Сафійскага сабора ў Полацку, праводзіць раскопкі і зандажы, якія дазволілі выявіць старажытныя фрэскі. Аднак рамонтныя працы на Барысаглебскім і Спаса-Ефрасіньеўскам манастырах па паведамленнях П. Пакрышкіна, праводзіліся непрафесійна: пярэстая алейная афарбоўка, няякасныя алейныя роспісы, несанкцыянаваныя раскопкі і г.д.

Выдаючы дазвол на рамонтныя працы цэркваў і храмаў у Магілёве, Оршы, Мсціславе, камісія ставіла і задачу выяўлення падчас прац старажытных роспісаў.

У перыяд масавага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі праваслаўных цэркваў (канец XIX – пачатак XX стст.) шматлікія драўляныя цэрквы падвяргаліся зносу. Імператарская археалагічная камісія ў шэрагу выпадкаў імкнулася захаваць унікальныя драўляныя храмы, рэкамендуючы іх перанос на новае месца. Напярэдадні першай сусветнай вайны было разабрана мноства драўляных касцёльных будынкаў.

Пад эгідай Імператарскай археалагічнай камісіі ахова помнікаў на тэрыторыі Беларусі здзяйснялася каля 20 гадоў (канец XIX – пач. XX ст.).

Адразу жа пасля рэвалюцыйных падзей 1917 года новыя ўлады прымаюць шэраг мер па ахове музеяў, палацаў і мастацкіх каштоўнасцей.

24 снежня 1923 года старшыня Прэзідыўма ЦВК БССР А.Р.Чарвякоў падпісаў Пастанову «Аб рэгістрацыі, узяцці на ўлік і ахове помнікаў мастацтваў, старажытнасці, побыту і прыродных месцаў, якія з'яўляюцца ўласнасцю арганізацый і грамадстваў, а таксама дзеляў твараў». Пастановай забараняўся вываз і продаж помнікаў культуры за мяжу, перадача ад аднаго ўладальніка іншаму.



Пастанова Савета народных камісараў ад 5 чэрвеня 1926 года абвяўляла дзяржаўнай уласнасцю шэраг помнікаў мастацтва, старажытнасці, побыту і прыроды і адначасова ўскладала на акруговыя, гарадскія і сельскія рады прыняцце дзейсных мер па ахове помнікаў і строгага назірання за выкананнем пастановы.

Аддзяленне царквы ад дзяржавы і праводзенне палітыкі адносна рэлігійных канфесій стымулявалі пашкоджанні і разбурэнні вялікай колькасці сакральных будынкаў, манастырскіх комплексаў, капліц. Манастырскія комплексы прыстасоўваліся пад розныя ўстановы, царкоўныя пад архівы, сховішчы, склады. У 1920–1930-я гг. пад лозунгам барацьбы з рэлігійным «опіумам», знішчаліся храмы ўсіх канфесій.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў адзначаны перыяд іншая сітуацыя. У Віленскім універсітэце фармуецца таварыства аматараў навукі. Галоўнай мэтай яго становяцца вывучэнне і захаванне помнікаў гісторыі і культуры. Ствараецца камісія па ахове помнікаў, якую ўзначаліў вядомы мастак Фердынанд Рушчыц. Да 1939 года былі абследаваныя, апісаныя і зафіксаваныя шматлікія помнікі сакральнай архітэктуры, сядзібы, паркі, гістарычная забудова гарадоў і мястэчкаў, сялянскія двары. Даследаванні павінны былі даць аснову для аднаўлення сапраўднага аблічча помнікаў, якія панеслі страты падчас непрафесійнай рэстаўрацыі і шкоды, прычыненай першай сусветнай вайной. Ф. Рушчыц выступіў з ідэяй стварэння пад Вільняй першага ва Усходняй Еўропе музея пад адкрытым небам, дзе павінны былі экспанавацца помнікі народнага дойлідства. Ян Булгак зафіксаваў на плёнку звыш 10 тыс. помнікаў архітэктуры, прыроды, сюжэтаў побыту. На жаль, калекцыі негатываў загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Напярэдадні першай сусветнай вайны вялікую працу па фотафіксацыі манументальных будынкаў Беларусі выканалі браты Барзункевічы. У заходніх рэгіёнах Беларусі імі былі зафіксаваныя шматлікія каменныя і драўляныя цэрквы і касцёлы, многія з якіх пасля былі знішчаныя войнамі і часам. Калекцыя фатаздымкаў Барзункевічаў у канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя была набытая фундаментальнай бібліятэкай імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Абшарніцкія сядзібы і палацы ў 1920–1930-я гады мінулага стагоддзя прыстасоўваліся пад патрэбы сельскіх лякарань, школ, ПТВ, хат адпачынку. Гэта спрыяла ў нейкай ступені іх захаванню і падтрыманню ў тэхнічна здавальняючым стане.

Вялікая Айчынная вайна прынесла каласальныя страты гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі. Было знішчана звыш 500 помнікаў дойлідства. Ператварыліся ў руіны кварталы гістарычнай забудовы гарадоў Брэста, Менска, Магілёва. Уцалелыя гістарычныя аб'екты і комплексы падвергліся варварскаму разрабаванню. Але ўжо ў 1942–1943 гадах адмысловая камісія пры Камітэце па справах мастацтваў пры СНК СССР зрабіла ўлік разбураных помнікаў дойлідства ў прыфрантавой паласе.

Вынікам усіх пасляваенных мерапрыемстваў і пастаноў у дадзенай вобласці стала прыняцце Закона Беларускай ССР «Аб ахове помнікаў гісторыі і культуры», на Сесіі Вярхоўнага Савета БССР 26 снежня 1969 года. Закону папярэднічала пастанова ЦК КПБ і Рады Міністраў БССР, ад 19 верасня 1967 года «Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры ў Беларускай ССР».

Да канца 60-х гадоў пры Міністэрстве культуры функцыянуе аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў (на правах главка), створаная сістэма інспектавання. У 1965 годзе створаныя спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні (СНРПМ), у чэрвені 1965 года пачынае дзейнічаць Добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. 7 снежня 1966 г. адбыўся I Устаноўчы з'езд, які прыняў Статут таварыства і абраў органы яго кіравання.

Ідэалагічны падыход да праблемы ў 60-е гады мінулага стагоддзя абумовіў разбурэнне шэрагу гістарычных ансамбляў і асобных помнікаў дойлідства. У адных выпадках гэта тлумачылася рэалізацыяй Генеральных планаў аднаўлення і рэканструкцыі гарадоў. Так знікла гістарычнае прадмесце Няміга ў Менску, ансамблі гістарычных цэнтраў Віцебска і Магілёва. У іншых з адкрытых ідэалагічных меркаванняў. Так былі знішчаныя Дабравешчанская царква XII ст. у Віцебску, касцёл «Фара Вітаўта» у Гародні, уніяцкая царква ў Бярэзвеччы, сабор святога Стэфана ў Полацку, касцёл пры калегіі езуітаў у Пінску і шматлікія іншыя сакральныя будынкі.

Да 1968 года быў складзены спіс помнікаў першачарговай важнасці, адчыненыя вытворча-рэстаўрацыйныя ўчасткі ў Полацку, Гомелі, Брэсце, Магілёве, гарадскім пасёлку Свет. Больш чым на 20 аб'ектах пачаліся працы па рэстаўрацыі і кансервацыі, у тым ліку, Сафійскаму сабору ў Полацку, Праабражэнскай царквы ў Заслаўі, руінах Брэсцкай крэпасці, капліцы Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі, Мікольскай царквы ў Магілёве. Пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 19 верасня 1967 года пры Міністэрстве культуры ствараюцца навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні. З гэтага года пачынаюць вылучацца бюджэтныя асігнаванні на рэстаўрацыю і кансервацыю помнікаў архітэктуры.

Пачынаецца вывучэнне вопыту рэстаўрацыі. Тут вялікую цікавасць для рэстаўратараў Беларусі меў вопыт Польшчы. Упершыню беларускія рэстаўратары сутыкнуліся з методыкай, якая прадугледжвае ў гістарычных гарадах падначаленне новай забудовы старой, вызваленне гістарычнага цэнтра ад транспарта. Новая забудова або канструктыўна-стылістычна, або з пункта погляду маштабу як бы працягвае старую (Гданьск) або кантрасна адцяняе старажытныя будынкі (Мальбарк).

У 1974 годзе СНРПМ былі завершаны праектна-рэстаўрацыйныя працы па помніку архітэктуры XVIII ст. – Ратушы ў г. Віцебску. Першапачатковае аблічча помніка моцна скажонае познімі зменамі: надбудовай



трэцяга паверху, прыбудовай порціка на месцы скразнога арачнага праезду, замена шпілявога завяршэння вежы ратондай, ліквідацыя аркады, аб'ядноўваўшай суседнія будынкі ў ансамбль. Праект рэстаўрацыі прадугледжваў аднаўленне архітэктурнага комплексу канца XVIII–XIX стст.

З'яўляюцца публікацыі, прысвечаныя даследаванням у вобласці драўлянага дойлідства. Працягваюцца даследаванні па гісторыка-горадабудаўнічым комплексам. Гістарычныя гарады Беларусі да сярэдзіны 70-х гадоў, нягледзячы на непрадуманую горадабудаўнічую палітыку першых пасляваенных дзесяцігоддзяў, усё ж захавалі значную колькасць архітэктурных помнікаў. Унікальным горадам у гэтым сэнсе з'яўляўся г. Гародня, які прапаноўвалася разглядаць асобна, як горад-помнік.

У сярэдзіне 70-х гадоў публікуюцца асобныя даследаванні па тыпах помнікаў архітэктуры: тэатрах, банкаўскіх будынках, сакральных будынках; па буйных гарадскіх ансамблях: Гародня, Віцебску, Пінску, Нясвіжу, Наваградку, Мсціславу. Дадзеныя даследаванні дапамагаюць фармаванню методыкі і падыходаў да комплекснага рашэння праблем аховы і рэстаўрацыі. Яны папаўняюць навуковую базу, неабходную для праектных пошукаў адмысловых навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў.

Да канца 70-х гадоў па-ранейшаму не спынялася крытыка СНРПМ. Распачаўшыя фактычна, сваю працу задоўга да афіцыйнага адчынення, у 1959 годзе, майстэрні не змаглі зладзіцца з двума праблемамі: падрыхтоўкай кваліфікаваных кадраў і стварэннем вытворчай базы. У выніку, палітыка ў вобласці рэстаўрацыі звялася да наступнага: значную частку помнікаў архітэктуры закансерваваць і весці рэстаўрацыю на аб'ектах першараднага значэння. Рэстаўраваны шэраг аб'ектаў Брэсцкай крэпасці. Рэстаўраваныя хаты-музеі Я. Купалы ў Вязынцы і Я. Коласа ў Мікалаеўшчыне. У 1977 году рэстаўрацыйныя працы вяліся на 20 помніках архітэктуры. Па ранейшым асноўныя сярод іх – Брэсцкая крэпасць, Сафійскі сабор, палац у Хальчы, касцёл у Мсціславе.

Упершыню ў рэспубліцы былі падрыхтаваныя спецыялісты па рэстаўрацыі станковага і манументальнага жывапісу, скульптуры, керамікі, мастацкаму каванню, разьбярству. У канцы 70-х гадоў у Менску прымаецца рашэнне аб комплекснай рэстаўрацыі ансамбля гарадской гістарычнай забудовы XIX – пачатку XX стагоддзяў – Траецкага прадмесця.

У распрацоўцы праекту прымалі ўдзел акадэмія мастацтваў, СНРПМ, інстытуты «Менск-праект», «Белжылпраект» і інш. Да выканання быў прыняты варыянт, распрацаваны калектывам архітэктараў пад кіраўніцтвам З.Г. Багласава.

У канцы 1980-х гг. азначылася тэндэнцыя пошуку сінтэзу гістарычнай забудовы і новых горадабудаўнічых рашэнняў. Дзяржбуд БССР сумесна з Міністэрствам культуры, Таварыствам аховы помнікаў, аблвыканкамамі распрацоўваюць праграму рэгенерацыі гістарычнай забудовы 35 гарадоў рэспублікі. Савет Міністраў рэспублікі зацвердзіў распра-

цаваныя Дзяржбудам «Правілы забудовы гарадоў», у якія ўключаўся адмысловы раздзел «Патрабаванні па ахове помнікаў гісторыі і культуры». Інстытут «Белдзяржпраект» распрацаваў серыю тыпавых праектаў 2–4-павярховых дамоў, прызначаных для будаўніцтва ў гарадах, дзе мелася малапавярховая каштоўная гістарычная забудова.

У 1987 годзе была практычна скончана рэстаўрацыя Сафійскага сабора ў Полацку, прыстасаванага пад залу арганнай музыкі. Завяршалася рэстаўрацыя Крыжаўздвіжанскай царквы, прыстасоўваемай пад планетар і музей драўлянай скульптуры. У памяшканні Брацкай царквы павінен быў размясціцца музей беларускага кнігадрукавання. Аблвыканкамы пачынаюць распрацоўваць планы рэстаўрацыі помнікаў да 2000 года.

У 1988 годзе быў адчынены ў сістэме аб'яднання «Белрэстаўрацыя» праектны інстытут «Белспецпраектрэстаўрацыя». Архітэктурна-рэстаўрацыйныя аддзелы былых СНРПМ былі пераўтвораныя ў Архітэктурна-канструктарскія майстэрні. Філіялы інстытута былі адчыненыя ў Гародні, Віцебску, Магілёве. Працягвалася распрацоўка маштабных праектаў рэканструкцыі Верхняга горада і Раманаўскай слабады ў Менску пад кіраўніцтвам З.Г. Багласова. Вядуцца працы па праекце рэстаўрацыі Старога Замка ў Гародне. У рэстаўрацыйна-праектным інстытуце ствараецца майстэрня па рэстаўрацыі помнікаў садова-паркавага мастацтва і драўлянага дойлідства (кіраўнік А. Лакотка).

Разам з тым, на перыферыі рамонтна-рэстаўрацыйнымі працамі спрабуюць займацца мясцовыя ўлады. Так, у Іўі рэстаўруецца вадзяны млын, у Паставах «абнаўляюцца» хаты XVIII–XIX стагоддзяў. У Мотоле вядзецца музеефікацыя цэнтра мястэчка.

У пачатку 90-х гадоў пачалася чарговая рэарганізацыя інфраструктуры рэстаўрацыі, і ў Беларусі пры Міністэрстве культуры завяршалася стварэнне Глаўка – Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў. Камітэт фактычна ліквідаваў аб'яднанне «Белреставрация». У пачатку 90-х гадоў адначасова са стварэннем Глаўка пачынае стварацца самастойная Дзяржаўная інспекцыя аховы нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны (ДзІНАС). Неўзабаве і Глаўк, і «ДзІНАС» пераходзяць у прамое веданне Савета Міністраў, дзе і функцыянуюць да сярэдзіны 90-х, пасля чаго ізноў вяртаюцца ў вядзенне Міністэрствы культуры.

У 1992 г. прымаецца Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», праз два года, у 1994 – Закон «Аб асновах архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Рост нацыянальнай самасвядомасці і будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы робяць актуальнымі праблемы рэстаўрацыі гістарычна значных ансамбляў. Галоўным з іх стаў Верхні горад у Менску.

Новай актуальнай праблемай стала наданне статусу і ахова помнікаў архітэктуры савецкага перыяду. Эмацыйныя адносіны да гэтай катэгорыі будынкаў, характэрныя для сярэдзіны 90-х гадоў, мяняюцца на навукова



абгрунтаванае разуменне значэння гэтай катэгорыі архітэктурна-горадабудаўнічай каштоўнасці. Забудова праспекта Ф. Скарыны, пляц і манумент Перамогі, Дом Урада, тэатр оперы і балета, прэзідыум Акадэміі навук даўно сталі нацыянальнымі архетыпамі. З імі ў Еўропе і свеце асацыіруецца вобраз Беларусі.

Узнаўленню гістарычнага цэнтра Менска і іншых гарадоў Беларусі аказвае сталую ўвагу і клопат Глава дзяржавы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Па яго распараджэнні прынята рашэнне аб адраджэнні помніка архітэктуры XIX ст., былой гасцініцы «Еўропа» у Менску.

Гістарычны дослед айчыннай рэстаўрацыі мяркуе рашэнне шэрагу праблем, якія ўплываюць на перспектывы дадзенай сферы.

1. Архітэктурна-гістарычнае асяроддзе на сучасным этапе актыўна інтэгруецца і становіцца неад'емнай часткай працэсу фармавання ландшафту і забудовы.

2. Гістарычная забудова з'яўляецца найгалоўным фактарам фармавання мастацкай канцэпцыі часу ў горадабудаўнічым мастацтве. Гэта агульная тэндэнцыя архітэктурна-горадабудаўнічага развіцця ў Еўропе. Гісторыка-архітэктурныя архетыпы ўвасабляюць выявы эпох і гістарычных этапаў эвалюцыі горада, нацыі і краіны.

3. Помнікі дойлідства ўвасабляюць нацыянальныя рысы архітэктуры, рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці, фарміруюць выяву пэўнага горада, раёна, тэрыторыі. Дзякуючы ім фармуецца ўспрыманне і паданне аб дадзенай краіне ў еўрапейскім і сусветным маштабе, аб яе ўкладзе ў развіццё сусветнай цывілізацыі.

4. Страты, панесеныя архітэктурна-гістарычнай спадчынай Беларусі ў сілу розных гістарычных чыннікаў, робяць праблему аховы помнікаў адной з найболей прыярытэтнай у дзяржаўнай палітыцы ў вобласці будаўніцтва і архітэктуры: ад гістарычнага ландшафту да гістарычнага раёна буйнога горада.

5. Архітэктурна-горадабудаўнічая спадчына – аснова развіцця айчыннага турызму, адной з найважных сфер са значнымі інвестыцыямі, якая спрыяе росту аўтарытэту краіны і яе прывабнасці для культурна-дзелавых адносін.

Вострую праблему ўяўляе ў рэстаўрацыі спалучэнне старога і новага. Адаптацыя помнікаў у гарадской серадзе, у прыватнасці крам рамеснікаў, даходных дамоў, гатэляў патрабуе іх забеспячэння сродкамі сучасных тэхналогій. Тут прысутнічаюць два метады: будынак новага «пад старога», або адкрыта сучасная архітэктура новаўвядзення, якая кантрасна адцяняе помнік.

Архітэктурна-горадабудаўнічая спадчына Беларусі, у сілу гістарычных чыннікаў, панесла вялікія страты. Цяперашнія маштабы рэстаўрацыі, прыкметна ўзрослыя за апошнія дзесяцігоддзі, тым не менш,

недастатковыя. У рэспубліцы існуе толькі адзін закансерваваны археалагічны помнік: «Старажытнае Бярэсьце». Гэта унікальны музей, стварэнне якога спрыяла адпрацоўцы методыкі захавання археалагічнай драўніны. Раскопкі ў нядаўнім мінулым Віцебска, Мсціслава, Менска выявілі каштоўныя фрагменты забудовы XII–XVII стагоддзяў. Кансервацыя і экспанаванне такіх помнікаў, вельмі важная з пункта погляду развіцця музейна-турыстычнай інфраструктуры. Эмацыйна-пазнавальнае значэнне закансерваваных археалагічных будынкаў у іх натуральных гарызонтах несумненна вышэй рэканструкцыі старажытных форм.

Вельмі важная кансервацыя фрагментаў старажытных храмаў XII–XIV стагоддзяў, выяўленых у Тураве, Мсціславе, Менску, Ваўкавыску, Гародні, Полацку, Пінску. Іх поўнае аднаўленне навукова не заўсёды апраўданае, а аптымальна абраны метад экспанавання археалагічных адкрыццяў дазволіць стварыць сапраўдную крыніцу ўспрымання гістарычных каранёў дадзенага горада.

Значную праблему ўяўляе рэстаўрацыя замкаў у Гародні, Наваградку, Гальшанах, Крэве, Любчы, Смалянах. Рэальна тут магчыма добраўпарадкаванне ландшафту, кансервацыя і фрагментарнае аднаўленне асобных форм, аб'ёмаў, памяшканняў. Вельмі важная кансервацыя і добраўпарадкаванне гарадзішчаў. Шматлікія з іх (Глянец, Менка, Банцараўшчына і інш.) могуць быць лёгка падлучаныя да дарожнай сеткі з арганізацыяй праезду і аўтастаянкі. Вялікі дослед у дадзенай вобласці назапашаны ў Польшчы.

Вялікую праблему ўяўляе рэстаўрацыя і прыстасаванне помнікаў сядзібна-паркавай архітэктуры. У рэспубліцы налічваецца звыш 150 такіх аб'ектаў. Складанасць у дадзенай сферы вызначаецца вялікім аб'ёмам ландшафтных прац: добраўпарадкавання, пасадак зялёных насаджэнняў. Тут архітэктар павінен працаваць з дасведчаным садоўнікам-дэкаратарам. У цяперашні час рэстаўрацыйныя працы, выкананыя на сядзібах у Гомелі, Завоссі, Жылічах, Хальчы, Снове, Свяцку. Мемарыяльныя сядзібы пераўтвораныя ў музеі (Завоссе, Залессе), функцыянальнае выкарыстанне іншых патрабуе ўліку мясцовай сацыяльна-культурнай інфраструктуры.

Каштоўны досвед быў здабыты падчас рэстаўрацый мемарыяльных месцаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча. Стварэнне на іх аснове ландшафтна-сядзібных запаведнікаў выпрашыла праблемы захавання помнікаў і прыродна-ландшафтнага асяроддзя. Фрагментарна такія праблемы вырашаныя і ў гарадах (хатка Э. Ажэшкі ў Гародні, хата У. Ваньковіча і хата-музей Я. Коласа ў Менску і інш.).

Актуальную праблему на дадзеным этапе ўяўляе захаванне гістарычных сёлаў і мястэчкаў. З 25 тысяч сёлаў і вёсак рэспублікі ў пачатку 1980-х гадоў мінулага стагоддзя было прапанавана каля 150 селішчаў аднесці да катэгорыі гістарычных (якія адрозніваюцца рэгіянальнымі асаблівасцямі культуры, планіроўкай і фрагментамі гістарычнай забудовы). Яўнымі паселішчамі-помнікамі з'яўляюцца Наносы на Мядзельшчыне, Нізкі на Уздзеншчыне, Горадная на Століншчыне і шматлікія іншыя.

З тысячы паселішчаў, у пачатку XX стагоддзя вядомых як мястэчкі, а цяпер гарады або буйныя сёлы, ёсць гэтак жа якія патрабуюць ахоўнага статуту. Гэта Крэва, Гальшаны, Трабы, Дзятлава, Любча, Ракаў, Івянец, Вішнёва, Будслаў, Сноў і шматлікія іншыя. Стварэнне нацыянальных, рэгіянальных і лакальных запаведнікаў і паркаў – найболей перспектыўная форма захавання прыроднай і гісторыка-культурнай спадчыны.

Па-ранейшаму актуальная праблема рэгенерацыі гістарычных цэнтраў гарадоў. У цяперашні час яўныя вынікі ў дадзенай вобласці бачныя на прыкладах Полацка, Гародні і Менска. Нягледзячы на спрэчнасць і супярэчлівасць шматлікіх дэталяў, Траецкае прадмесце, Ракаўскае прадмесце і Верхні горад у Менску знаходзяць рысы скончаных гісторыка-горадабудаўнічых ансамбляў. У рэстаўрацыйнай методыцы пераважаюць рэканструктыўныя прыёмы, адсотак сапраўднага матэрыялу ніжэй адсотка новых уключэнняў, што тлумачыцца як эканамічнымі меркаваннямі, так і трактоўкай вартасных параметраў забудовы XIX – пачатку XX стагоддзяў.

Задачай нацыянальнага маштабу з'яўляецца рэстаўрацыя гістарычных помнікаў і ансамбляў Нясвіжа (замак, паркі, гарадская забудова).

Усе гэта можа быць вырашана толькі комплекснай дзяржаўнай праграмай па аднаўленні гісторыка-культурнай спадчыны (дадатак).

## РАЗДЗЕЛ II. ПРЫНЦЫПЫ СУЧАСНАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ

### § 1. Міжнародныя дакументы па кансервацыі і рэстаўрацыі

Адным з першых міжнародных дакументаў у галіне аховы помнікаў і рэстаўрацыі стаў Пакт Рэрыха. Ён быў прапанаваны рускім мастаком-гуманістам Мікалаем Рэрыхам у 20-я гады мінулага стагоддзя. Ідэя заключэння Пакта ўзнікла пад цяжкім уражаннем ад страт, нанесеных культурным каштоўнасцям падчас сусветнай вайны. У 1929 г. мастак выдае праект міжнароднага дагавора аб абароне культурных каштоўнасцей ва ўмовах узброенага канфлікта, разам са зваротам да ўрадаў усіх краін. Дакумент атрымаў шырокую вядомасць у свеце, а яго дэвіз «Мір праз культуру» быў падтрыманы грамадскасцю многіх краін.

Першымі прынялі рэзалюцыю аб прыняцці Пакту Рэрыха краіны Панамскага саюзу. Гэта адбылося 15 красавіка 1935 г. у Вашынгтоне, дзе быў падпісаны дагавор аб ахове мастацкіх і навуковых устаноў і гістарычных помнікаў, які атрымаў назву Вашынгтонскага пакта (дадатак).

Ідэі Рэрыха становяцца зноў актуальнымі пасля другой сусветнай вайны, і ў многіх краінах свету праводзяцца кампаніі за прыняцце Пакта

Рэрыха ў выглядзе міжнароднай канвенцыі. Вынікам стала прыняцце міжнароднай канвенцыі аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброеных канфліктаў.

Канвенцыя была прынята ў Гаазе ў 1954 г. на міжнароднай канферэнцыі, скліканай ЮНЭСКА. Ва ўступе да канвенцыі распавядалася пра страты, нанесеныя вайной і азначалася, что гэта страты агульнасусветныя. У асноўнай частцы падаецца вызначэнне каштоўнасці. Згодна канвенцыі былі прапанаваны тры віды каштоўнасцей:

1) рухомыя і нерухомыя каштоўнасці, маючыя вялікае значэнне для культуры кожнага народа (помнікі архітэктуры, мастацтва, гісторыі);

2) будынкі, галоўным прызначэннем якіх з'яўляецца захаванне і экспанаванне каштоўнасцей (музеі, архівы, бібліятэкі);

3) цэнтры, у якіх ёсць значная колькасць культурных каштоўнасцей (комплексныя помнікі).

Пад абаронай культурных каштоўнасцей канвенцыя разумее ахову і павагу да ўсіх відаў каштоўнасцей. Згодна канвенцыі забараняецца выкарыстоўваць каштоўнасці і прылеглыя да іх тэрыторыі, калі яны могуць быць пашкоджаны падчас ваенных дзеянняў. Забаранялася таксама рэквізіраваць каштоўнасці на тэрыторыі іншых дзяржаў.

У 1931 г. на першым кангрэсе рэстаўратараў была прынята Афінская хартыя (дадатак), у якой фармуляваліся асноўныя прынцыпы і палажэнні тагачаснай рэстаўрацыі.

Шмат увагі пытанням рэстаўрацыі надавалася ў пасляваенны час на першым і другім кангрэсах архітэктараў, якія адбыліся ў Парыжы (1957 г.) і ў Венецыі (1964 г.). У рашэннях першага кангрэса адзначалася, што помнікі трэба ахоўваць, а не рэстаўрыраваць і прапаноўвалася каардынаваць мерапрыемствы па ахове помніка з новай забудовай.

У вырашэннях Парыжскага кангрэса дазвалялася частковая рэстаўрацыя, але пры абавязковым выкананні трох умоў: калі стан помніка прымушае правесці тэрміновую рэстаўрацыю; калі добра вядомы першапачатковы выгляд помніка, калі рэстаўрацыя не нясе шкодных наступстваў.

Другі кангрэс пашырыў гэтыя палажэнні і забараніў узвядзенне новых аб'ектах у гістарычнай забудове. Усяго на гэтым кангрэсе было прынята 13 разнастайных дакументаў, сярод якіх: Венецыянская хартыя; рэзалюцыя аб стварэнні ІКАМОС; рэзалюцыя па пытаннях выкладання рэстаўрацыі і кансервацыі і інш. Асноўным дакументам кангрэса стала Венецыянская хартыя (дадатак).

У гэтай хартыі былі выкладзены тэарэтычныя прынцыпы і прапановы да кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў у міжнародным маштабе:

- пры кансервацыі і рэстаўрацыі неабходна выкарыстоўваць усе галіны навукі, і трэба ўлічваць атачэнне помніка, яно звязана з помнікамі і не павінна разбурацца. Нельга перасоўваць помнікі на новыя месцы. Нельга аддзяляць ад помніка элементы дэкору;



- рэстаўрацыя праводзіцца ў выключных выпадках, калі неабходна захаваць помнік. Рэстаўрацыйныя работы павінны абапірацца на подлінныя дакументы. Рэстаўрацыя заканчваецца там, дзе пачынаецца гіпотэза. Калі традыцыйная тэхналогія не падыходзіць, рэстаўрацыя праводзіцца на аснове сучаснай тэхнікі;
- усе напластаванні розных эпох неабходна захоўваць. Узноўленыя часткі павінны быць гарманічна сагласаваны з помнікам аднак адрозніваецца ад помніка;
- археалагічныя раскопкі павінны праводзіцца згодна з нормамі, прынятымі ЮНЭСКА ў 1956 г.;
- усе работы па кансервацыі і рэстаўрацыі павінны суправаджацца падрабязнай дакументацыяй, усе стадыі работ павінны фіксавацца. Публікацыі падобных матэрыялаў вельмі пажаданы.

Хартыя па ахове гістарычных гарадоў была прынята ў 1987 г. у Вашынгтоне (дадатак). У хартыі даецца вызначэнне гістарычных гарадоў і славутых мясцін. Вызначаны метады і сродкі аховы гістарычных гарадоў, шмат увагі нададзена прыцягненню мясцовых жыхароў да справы аховы.

Музейныя захавальнікі разам са спецыялістамі ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі падзяляюць адказнасць за захаванне культурнай спадчыны і гісторыка-культурных каштоўнасцей. Гэта замацавана ў кодэксе прафесійнай этыкі ІКОМ, дзе сказана: «адна з галоўных задач музейнага работніка – забяспечыць захаванасць музейных калекцый. Музейныя работнікі павінны мець неабходны набор ведаў аб метадах прэвентыўнай кансервацыі, уключаючы стварэнне бяспечнага асяроддзя дзеля аховы музейных прадметаў ад старэння і штучных прычын разбурэння».

## § 2. Прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі

Асноўнай мэтай любых работ, што праводзяцца на помніку архітэктуры, з'яўляецца падаўжэнне яго існавання. Непасрэдна гэтая задача зводзіцца да кансервацыі, якая адзінадушна прызнаецца асноўным відам работы, што павінна праводзіцца на помніку. Важная ўмова падаўжэння жыцця помніка, уключэнне яго ў сучаснае жыццё грамадства. Гэта робіцца двума шляхамі: праз выяўленне мастацкай і гістарычнай каштоўнасці помніка (рэстаўрацыя) і праз наданне помніку практычных функцый (прыстасаванне).

У адрозненні ад кансервацыі рэстаўрацыя прадугледжвае ўнясенне шэрагу зменаў у помнік. Таму рэстаўрацыя заўсёды з'яўляецца парушэннем існуючай сістэмы ўзаемасувязей у помніку і разглядаецца як выключная з'ява, абумоўленая цэлым шэрагам абмежаванняў.

Адна з галоўных тэарэтычных установак рэстаўрацыі, тое што мастацка каштоўным аб'ектам з'яўляецца не задумка старажытнага майстра, а помнік у тым выглядзе, у якім ён існуе (з усімі стратамі, напластаваннямі і ўсталяваўшыміся сувязямі з акаляючым асяроддзем). Рэстаўратар

уздзейнічае не на мастацкі вобраз помніка, а на яго матэрыяльную структуру. Помнік разглядаецца як сховішча мастацкай і гістарычнай інфармацыі. Рэстаўратар можа ўскрыць і схаваную інфармацыю, напрыклад, старажытныя фрэскі пад больш позняй тынкоўкай. Такім чынам яшчэ адна задача рэстаўратара – максімальнае раскрыццё мастацкіх якасцей, захаваўшыхся да нашага часу помнікаў і іх гістарычных асаблівасцей.

Мастацкія якасці ўключаюць у сябе ўвесь кантэкст мастацкіх узаемасувязей паміж першапачатковымі часткамі і пазнейшымі напластаваннямі, а таксама паміж помнікам і архітэктурна-прасторавым асяроддзем. Па гэтай прычыне не дапускаецца ўзвядзенне частак будынку, якія былі запланаваны, але не былі выкананы, калі нават існуюць усе аўтарскія дакументы.

Сучасная тэорыя выпрацавала новыя адносіны да больш позніх наслаенняў. Яны маюць асобную гістарычную і мастацкую каштоўнасць, як самастойныя творы і як частка помніка. Аднак гэта не значыць, што трэба захоўваць усе наслаенні, напрыклад, больш позняя тынкоўка, схаваўшая роспіс, уталітарная прыбудова да фасада, закладка праёмаў не з'яўляюцца носьбітамі мастацкай інфармацыі, а наадварот закрываюць мастацкія каштоўнасці ў помніку. Аднак і тут неабходны асцярожны падыход да выдалення наслаенняў.

Другое патрабаванне да рэстаўрацыі – максімальнае захаванне сапраўдных частак. Копія ніколі не заменіць арыгінал. Таксама асцярожна трэба адносіцца да замены пашкоджаных частак помніка. Яна дапускаецца толькі ў выключных выпадках.

Усе новыя элементы ў помніке павінны вылучацца. Гэта так званая *сігнацыя.* Але неабходна, каб арыгіналаў было больш, чым рэстаўраваных частак. Існуюць выключэнні пры рэстаўрацыі комплексных помнікаў, калі могуць аднаўляцца асобныя будынкі. Усе новыя дапаўненні абмяжоўваюцца ўмовамі дакладнасці ўзнаўлення і ўсе павінны быць дакументальна падцверджаны (рэстаўрацыя сканчаецца там, дзе пачынаецца гіпотэза). Таксама абавязкова трэба ўлічваць, як будзе выглядаць помнік пасля рэстаўрацыі, і як ён будзе ўспрымацца.

Звычайна выдзяляюць тры віды работ на помніках архітэктуры: *рэстаўрацыя, кансервацыя і рамонт.* Да ўсіх відаў работ ёсць агульныя патрабаванні. Яны выконваюцца толькі з ведама дзяржаўных органаў аховы помнікаў. Праводзіцца папярэдняе вывучэнне помніка, якое працягваецца і падчас правядзення работ. *Рамонт* – перыядычна праводзімыя работы, для падтрымання помніка, робяцца звычайнымі будаўнічымі метадамі. Галоўныя віды рамонтных работ: змена і афарбоўка дахаў, узнаўленне тынкоўкі, афарбоўка сцен і г.д. Усе работы праводзяцца пад назіраннем спецыяліста-рэстаўратара. *Кансервацыя* – работы па захаванні помніка ў тым стане, у якім ён захаваўся да нашага часу. Бывае *часовая* і *доўгатэрміновая.* Пры правядзенні кансервацыі робяцца дадатковыя канструкцыі, якія павінны забяспечыць захаванне помніка. Новыя канструкцыі лепш рабіць скрытымі. Спецыфічны від кансервацыі – *кансервацыя руінаў.* Гэта тыя помнікі, якія дайшлі да нашага часу ў зруйнаваным выглядзе і ў гэтым выглядзе асэнсаваны як помнікі. Значная колькасць такіх помнікаў ускрыта падчас раскопак. Такія помнікі не аднаўляюцца, а толькі кансервуюцца. Пры кансервацыі выкарыстоўваюць *анастылоз* і элементы добраўпарадкавання, пры дапамозе якіх выяўляюць план будынка. Страчаныя часткі сцен, слупоў і калон азначаюць умоўна малюнкам забрукоўкі ці ўстаноўкай на месца асобных дэталей помніка.



*Рэстаўрацыя* – найбольш складаны від работ. Уключае ў сябе элементы і рамонта і кансервацыі. Выпадкі рэстаўрацыі розныя, як і помнікі. Аднак, гэта адмова ад аднаўлення стылістычнага адзінства, прызнанне каштоўнасці больш позніх наслаенняў, узнаўленне толькі тых элементаў, форма якіх можа быць дакументальна падцвержана. Такая рэстаўрацыя называецца *фрагментарнай.*

Рэстаўрацыя складаецца з двух частак: *раскрыцця і ўзнаўлення страчаных элементаў.* Раскрыццё магчыма тады, калі ўбіраемыя часткі не маюць цікавасці ні мастацкай, ні гістарычнай. Раскрыццё недапускальна, калі яно робіць пагрозу ўстойлівасці будынка, ці шкодзіць умовам яго захавання.

У простых выпадках рэстаўрацыя зводзіцца да звычайнага раскрыцця; як напрыклад выдаленне тынкоўкі на фасадах Сафійскага сабора ў Кіеве, раскрыццё гатычнай муроўкі на будынках Львова і Каўнаса.

Можа быць толькі дапаўненне, задзелка трэшчын, узнаўленне зубцоў. Аднак часцей за ўсё рэстаўрацыя гэта адначасова і раскрыццё і дапаўненне. Раскрыты подлінік вельмі рэдка бывае поўнасцю захаваўшымся, і патрэбна узнаўленне некаторых частак. Выкананне рэстаўрацыйных дапаўненняў звязана з выкананнем некаторых патрабаванняў, адно з іх – веданне будаўнічых тэхналогій мінулага і ўменне ўзнаўляць яе. Звяртанне да традыцыйных матэрыялаў і будаўнічай тэхнікі забяспечвае гарманічнае візуальнае ўспрыяцце старых і новых частак у помніку.

Да нашага часу не выпрацавана адзінай сістэмы азначэння рэстаўрацыйных дапаўненняў. Усё залежыць ад характару помніка. *Сігнацыя* выкарыстоўваецца для асноўнага матэрыяла сцяны. Калі сцяна атынкавана, ці афарбавана сігнацыя не робіцца. Абазначаюцца не ўсе дапаўненні, а толькі найбольш значныя, як па памерах, так і ў сэнсавым значэнні.

Выкарыстоўваюць наступныя абазначэнні: абазначэнне новых уключэнняў каляровым ці заглубленым швом, выкарыстанне цэглы са спецыяльнай маркіроўкай, выдзяленне колерам.

Цэласная рэстаўрацыя калі ўзнаўляецца ўвесь помнік, дапускаецца як выключэнне. Пры гэтым нельга скарыстоўваць ніякіх аналогій і домыслаў.

Трэба ўлічваць і ўтылітарнае прызначэнне помніка архітэктуры. Дзякуючы практычнаму выкарыстанню помнікаў, яны лепш упісваюцца ў сучаснае жыццё. Галоўнае правільны выбар новай функцыі. Улічваюцца мясцовыя патрабаванні, транспартныя магчымасці і шмат іншага. Для най-

больш каштоўных помнікаў арітэктуры бывае магчымы толькі адзін спосаб – музеефікацыя, калі сам будынак становіцца экспанатам. Адрэстаўраваныя помнікі аддаюць пад музеі канцэртныя залы, адміністрацыйныя ўстановы, ці выкарыстоўваюць па іх першапачатковаму прызначэнню.

## РАЗДЗЕЛ III. РЭСТАЎРАЦЫЯ І КАНСЕРВАЦЫЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ

### § 1. Рэстаўрацыя і кансервацыя металічных вырабаў

Усе вырабы з металу, за выключэннем золата і плаціны, у той ці іншай ступені падвяргаюцца карозіі.

Карозіяй называецца разбурэнне металу, вызванае дзеяннем акаляючага асяроддзя. Разбурэнне звычайна пачынаецца з паверхні метала і паступова распаўсюджваецца ўглыб. Пры гэтым метал мяняе знешні выгляд: ён губляе бляск, гладкая паверхня становіцца шурпатай і пакрываецца хімічнымі злучэннямі, якія звычайна складаюцца з метала і кіслароду, з метала і хлора і г.д. Характар і хуткасць з'яўлення карозіі залежаць ад складу (сплава) метала і фізічна-хімічных умоў асяроддзя. Гэты працэс можа працягвацца і ў музейных умовах.

У музеі і прыватныя калекцыі часта паступаюць знойдзеныя выпадкова або ў выніку археалагічных раскопак дробныя рэчы: манеты, медалі, упрыгожанні, гузікі і іншыя вырабы. Калі большасць жалезных вырабаў – сякеры, сярпы, косы, нажы, розная зброя, у тым ліку і састаўная (панцыры і кірасы, мячы і шаблі, ружжы і пісталеты) і некаторыя вялікія прадметы з каляровых металаў можна ачысціць механічна, то дробныя экспанаты, якія паступаюць у вельмі дрэнным стане, патрабуюць чысткі, адмыўкі, рэстаўрацыі і кансервацыі.

Чыстка і кансервацыя дробных вырабаў, асабліва ўпрыгожанняў, манет, медалёў, сфрагістычнага (актавыя пячаткі і гандлёвыя пломбы) і метралагічнага (вагі і гіркі-разнавагі) матэрыялу мае важнае значэнне для даследаванняў (класіфікацыі і даціроўкі вырабаў) і спосабу музейнага захавання.

*Чыстка і кансервацыя прадметаў мае наступную паслядоўнасць*:

а) вызначэнне металу вырабу, ступені захаванасці і наяўнасці на ім вокіслаў;

б) механічная або хімічная чыстка, прамыўка вадой;

в) сушка;

г) кансервацыя (у тым ліку і паціціраванне).

Пры ачыстцы дробных вырабаў рэстаўратару неабходна ўлічваць некаторыя рэкамендацыі:

- пажадана радзей выкарыстоўваць механічныя прылады – нож, стамеску, скальпель, напільнік або наждачную паперу, таму што яны могуць папсаваць або зусім знішчыць выяву на паверхні прадмета;



- ні ў якім разе нельга выкарыстоўваць насычаныя (канцэнтраваныя) кіслоты, асабліва саляную або серную, бо імі можна знішчыць поўнасцю прадмет;
- нельга награваць прадмет або камяк зліплых прадметаў на агні і апускаць іх у халодную ваду. Гэта можа разбурыць прадмет;
- нельга выкарыстоўваць дробную вібрацыю пры ачыстцы, бо прадмет можа разваліцца на дробныя фрагменты;
- пры хімічнай ачыстцы нельга апускаць у адну ёмкасць вырабы з розных металаў або сплаваў, бо можа адбыцца іх гідроліз; посуд для хімічнай ачысткі не павінен уступаць у хімічную рэакцыю з кіслотамі або металамі, таму выкарыстоўваць трэба шкляны, фаянсавы або пластмасавы. Прадметы павінны быць поўнасцю пакрыты растворам, каб яны не ўзаемадзейнічалі з паветрам;
- вырабы з серабра, медзі і бронзы часам пакрыты пацінай, якая ўтварылася за шмат стагоддзяў. Яна ахоўвае іх ад разбурэння, таму яе пажадана захаваць, калі няма кіслотных або салявых наслаенняў. Паціна на серабры бывае ад светла-шэрага да чорнага колеру, на медзі – ад светла-карычневага да цёмна-карычневага (шакаладнага) або чырвона-карычневага колеру, на бронзе –светла-карычневага, чырва-наватага або зеленаватага. Старажытная антычная бронза мае «высакародную» зялёную паціну;
- неабходна памятаць, што методыку, якая падыходзіць пры ачыстцы вялікіх прадметаў (сякера, лямеш, каса, шабля і г.д.), нельга ўжываць да дробных, у першую чаргу з-за памеру і матэрыялу, з якіх яны выраблены.

Пасля фіксавання месца і часу знаходкі прадмета вызначаецца метал, з якога ён выраблены, і яго стан на момант паступлення на рэстаўрацыю. Гэта дазваляе вызначыць спосаб ачысткі і кансервацыі. Калі прадмет пакрыты коркай (соль, вокіслы, гразь і іншыя наслаенні), то яго трэба апусціць у цёплую ваду, у якой прадмет адмываецца.

Метал дробных вырабаў можа быць розны – жалеза, медзь, бронза, волава, свінец, серабро або золата. Яны па-рознаму захоўваюцца, і таму выкарыстоўваецца розная методыка ачысткі і кансервацыі. Сярод знаходак больш за ўсё распаўсюджаны дробныя вырабы з жалеза (пярсцёнкі, бранзалеты, шыйныя грыўны, шпількі, падвескі, наканечнікі стрэл і г.д.), бронзы і медзі (розныя ўпрыгожанні, дробныя прылады працы, манеты і метралагічныя вырабы), серабра (упрыгожанні, манеты і медалі), свінца і свінцова-алавяных сплаваў (некаторыя тыпы ўпрыгожанняў і дапаможныя прылады працы для ювеліраў). Даволі рэдка сустракаюцца прадметы з волава.

Неабходна адразу адзначыць, што дрэнна захоўваюцца алавяныя і алавяна-свінцовыя вырабы. Чыста алавяныя рэчы, якія знойдзены ў зямлі, практычна не падлягаюць рэстаўрацыі, таму што яны могуць быць пашкоджаны так званай алавянай чумой, якая выклікаецца рознымі кіслотамі, павышанай вільгаццю і нізкай тэмпературай, і праз некаторы час ператвараюцца ў парашок.

Знаходкі з волава трэба адразу ж ачышчаць механічна з дапамогай скальпеля і шчоткі і зафіксаваць (сфатаграфаваць і замаляваць). Крыху лепш захоўваюцца алавяна-свінцовыя прадметы. Яны пакрыты белым налётам, які можна зняць толькі хімічным шляхам.

Лепш за ўсё захоўваюцца вырабы з золата. Яны не падвяргаюцца карозіі, іх можна адмыць у цёплай вадзе, абястлушчыць і прасушыць.

Прадметы з сярэбраных сплаваў захоўваюцца горш, асабліва білон (да 40–60% серабра), таму што ён утрымлівае некаторы працэнт медзі. З-за гэтага прадметы, якія доўга знаходзіліся ў сырым або кіслым асяродку, часта бываюць пакрыты вокісламі зялёнага колеру. Чыстка прадметаў з сярэбраных сплаваў праводзіцца ў асноўным хімічным шляхам. Для гэтага выкарыстоўваецца медыцынскі нашатырны спірт (5-працэнтны раствор аміяку), які пасля ачысткі вокіслаў робіцца сіні або зялёны. Для ачысткі сярэбраных вырабаў можна выкарыстоўваць 5-працэнтны раствор сернай кіслаты або 5–10-працэнтны раствор мурашынай кіслаты, крыху яго падагрэўшы.

Для ачысткі вырабаў з бронзы і медзі выкарыстоўваецца некалькі спосабаў, якія залежаць ад колеру вокіслаў. Для таго каб ачысціць вішнёва-чырвоны налёт, выкарыстоўваецца 5–15-працэнтны (тэхнічны) раствор аміяку або 5–10-працэнтны раствор вуглякіслага амонію, які менш уздзейнічае на метал. Цёмна-зялёны налёт ачышчаецца 5–10-працэнтным растворам лімоннай кіслаты, а жаўтавата-бледны налёт вуглякіслага свінцу – 10-працэнтным растворам воцатнай кіслаты. Пасля кожнай аперацыі прадмет неабходна прамываць, каб вызначыць яго захаванасць. Прадмет бывае іншы раз поўнасцю мінералізаваны, і яго трэба неяк зафіксаваць – пасля дадатковай механічнай ачысткі замацаваць лакам або парафінам, сфатаграфаваць або замаляваць. Калі прадмет мінералізаваны, яго лепш ачышчаць механічна, і калі выява на ім больш-менш відаць, то на гэтым варта і спыніцца. Але калі прадмет не ачышчаецца да стану, які патрэбны для даследавання, то можна часткова яго адмываць 5-працэнтным растворам едкага натрыю або вуглякіслага амонію.

На прадметах з жалеза, паступаючых у рэстаўрацыю, назіраюцца розныя віды карозіі: паверхневая раўнамерная, кропкавая і інтэркрышталітная – паміж крышталямі.

Паверхневая раўнамерная карозія ўтвараецца ў большасці выпадкаў на метале, які знаходзіцца на вольным паветры, і распаўсюджваецца раўнамерна па ўсёй паверхні металічнага прадмета ў выглядзе плёнкі вокіслаў. Калі гэта плёнка (яе называюць паціна) пакрывае прадмет роўным гладкім слоем, то яна перашкаджае далейшаму пранікненню газаў і вадкасцей у сярэдзіну метала і гэтым перашкаджае далейшаму разбурэнню. Паціна на бронзавых прадметах добра засцерагае гэтыя прадметы ад далейшага разбурэння. Паціна, якая пакрывае прадметы з жалеза, не валодае ахоўнымі ўласцівасцямі. Яна змяшчае шматлікія поры і трэшчыны, скрозь якія параўнальна лёгка праходзяць газы і вадкасці, вызываючыя працяг карозіі.

Назіраюцца выпадкі кропкавай карозіі, калі разбураецца не ўся паверхня металічнага прадмета, а толькі асобныя невялікія ўчасткі. Пры гэтым, як правіла, разбурэнне ідзе ўглыб метала, ствараючы глыбокія язвы, якія прыводзяць да ўтварэння выпадаў з рэзка акрэсленымі краямі.

Пры інтэркрышталітнай карозіі разбурэнне метала адбываецца з-за парушэння сувязі паміж крышталямі метала і распаўсюджваецца глыбока ўсярэдзіну. Прадметы, пашкоджаныя такой карозіяй, становяцца крохкімі і пры ўдары рассыпаюцца на кавалкі. Такі від карозіі безумоўна з'яўляецца адным з самых небяспечных.

Вельмі часта на адным аб'екце можна назіраць адначасова дзеянне некалькіх відаў карозіі.

Дробныя жалезныя вырабы ў музейнай практыцы ў асноўным ачышчаюць пры дапамозе слабага раствору салянай кіслаты да поўнай ліквідацыі вокіслаў, пасля чаго добра адмываюць і падвяргаюць кансервацыі. Перш чым пачаць кансервацыю вырабаў з жалеза, неабходна улічыць захаванасць металічнага ядра. Прадметы падзяляюць на 3 групы:

1. Прадметы пашкоджаныя карозіяй, без металічнай асновы, са скажонай формай і павялічаным першапачатковым аб'ёмам.

2. Прадметы, у якіх паверхня пашкоджана іржаўчынай, але захавалась ядро. Таксама скажае форму і аб'ём прадметаў.

3. Форма і аб'ём захаваліся, але тонкі слой карозіі.

Нават ачышчаныя ад карозіі і забруджванняў, прадметы працягваюць разбурацца ў памяшканнях з нерэгулюемым тэмпературным рэжымам. Пры так званай крытычнай вільготнасці, вільгаць з паветра кандэнсуецца на паверхні метала, утвараючы суцэльную плёнку, што і з'яўляецца галоўнай прычынай карозіі. Перад кансервацыяй вырабы з жалеза і каляровых металаў прасушваюцца ў ацэтоне або спірце 30–60 хвілін.

Дзеля папярэджання карозіі металу прадметы пакрываюць ахоўнымі саставамі на арганічнай аснове. Выкарыстоўваюць: алеі, змазкі, плёнкаутвараючыя пакрыцці. Выбар кансервацыйнага матэрыяла залежыць ад стану паверхні метала, умоў захавання, а таксама эстэтычных патрабаванняў.

Асноўным ахоўным матэрыялам для захоўвання металічных рэчаў раней былі пластычныя змазкі (вазелін, пушачная, ПВХ), якія ахоўвалі метал ад карозіі толькі пры нанясенні іх тоўстым слоем. Яны вельмі працаёмкія ў кансервацыі, і пасля кансервацыі, псуюць знешні выгляд рэчаў. З эстэтычных меркаванняў пры кансервацыі металічных прадметаў наносяць тонкі слой змазкі, які забяспечвае ахову метала на тэрмін не болей 1 года.

Шырока выкарыстоўваць прыродны і сінтэтычны воск: пчаліны воск, парафін, цэрэзін, монтавоск і інш.

Сінтэтычны воск (цэрэзіны) мае лепшыя ахоўныя якасці. Кансервацыю праводзяць шляхам пагружэння прадметаў, распылення ці пэнзлем. Пры выкарыстанні расплаўленага воска крохкае жалеза механічна замацоўваецца. Аднак гэты спосаб не падыходзіць для кансервацыі склееных рэчаў з-за высокай тэмпературы (80–120$^0$С). Воск дрэнна выдаляецца пры паўторнай рэстаўрацыі.

У апошні час выкарыстоўваюцца плёнкаўтваральныя пакрыцці на аснове палімераў. Асноўны накірунак сучаснай кансервацыі – выкарыстанне інгібіраваных матэрыялаў, якія пераўзыходзяць традыцыйныя матэрыялы. Па механізму ўздзеяння іх падзяляюць на экраніруючыя і хемосарбцыённыя. Выкарыстоўваюць і так званыя лятучыя інгібітары.

## § 2. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва

Дрэва вельмі распаўсюджаны матэрыял для вытворчасці разнастайных прадметаў. Дрэва выкарыстоўвалася ў традыцыйнай архітэктуры, для вырабу прылад працы, мэблі, і г.д. Рэшткі драўляных вырабаў даволі часта знаходзяць падчас археалагічных даследванняў. Выкарыстоўваліся разнастайныя пароды дрэва, напрыклад у Ноўгарадзе знойдзена 27 разнастайных парод дрэва. Негледзячы на сваю нетрываласць, некаторыя вырабы з дрэва могуць даволі доўга захоўвацца ў культурным слоі. Гэта адбываецца, калі ў культурным слоі павышаная вільготнасць і няма доступу кісларода. Драўляныя вырабы, ці рэшткі дрэва, знойдзеныя падчас раскопак, нельга адразу даставаць з культурнага слою. Лепш памясціць іх у вільготнае асяроддзе ці ў ваду. Потым у камеральных умовах праводзіцца сушка дрэва. Для гэтага выкарыстоўваюць спецыяльныя гіпсавыя формы, якія змяшчаюцца ў вільготных апілках. Высушанае дрэва пакрываецца лакам на аснове ільнянога алею ці каніфолі. Аднак, негледзячы на гэта, усушка матэрыяла працягваецца, да таго ж пакрытыя лакам вырабы блішчаць.

Таксама выкарыстоўваецца яшчэ адзін спосаб сушкі, калі адбываецца замена вады ў порах дрэва на спірт і ацэтон, пасля іх выціскаюць эфірам ці бензолам. У сваю чаргу іх замяняюць парафінам, воскам ці каніфоллю. Таксама выкарыстоўваўся спосаб замены вады спіртам, з паступовым яго выпарваннем і прапіткай дрэва растворам сталярнага клею, аднак гэты спосаб вельмі пажаранебяспечны.

Самы лепшы спосаб кансервацыі дрэва – выкарыстанне прапіткі сінтэтычнымі матэрыяламі і смоламі. Пры выпрацоўцы метада кансервацыі выдвігаецца шэраг патрабаванняў: метад апрацоўкі павінен быць нетаксічным, пажарабяспечным, недарагім, забяспечыць захаванне формы, памераў, колеру і інш., павысіць біястойкасць матэрыяла, мець магчымасць рэстаўраваць фрагменты і каб пры неабходнасці можна было вывесці састаў з драўніны без страты для матэрыялу.



Для кожнага канкрэтнага аб'екта неабходны падбор розных сродкаў аховы. Трэба ўлічваць галоўны накірунак абароны, напрыклад, ад біялагічнага разбурэння, зніжэнне ўзгарання, умацаванне і г.д. Таксама неабходна ўлічваць фізіка-хімічныя якасці ахоўных прэпаратаў. Пры правядзенні кансервацыі выкарыстоўваюцца разнастайныя спосабы апрацоўкі і прапіткі. Пры прапітцы старой, гнілой драўніны, ахоўны сродак павінен быць уведзены глыбей зоны гнілі. Ахоўная абалочка павінна быць тоўстай, недзе 40–50 мм. Для новай ці добразахаванай драўніны можна выкарыстоўваць і тонкі слой.

Адной з задач сучаснай музейнай практыкі з'яўляецца захаванне помнікаў драўлянага дойлідства. Асабліва гэта актуальна для музеяў пад адкрытым небам. Для захоўвання помнікаў неабходна іх абарона ад вільгаці і ўздзеянняў знешняга асяроддзя, дзеля гэтага неабходны канструкцыйныя меры і выкананне правіл эксплуатацыі. У якасці дадатковых мер прапануецца хімічная апрацоўка. Тут усё залежыць ад эфектыўнасці ахоўных сродкаў і спосабаў апрацоўкі і прапіткі драўніны.

Раней выкарыстоўвалі прэпарат СД, утрымліваючы сульфат амонія і дыямонійфасфат, ён выкарыстоўваўся рэстаўрацыйнымі майстэрнямі так і непасрэдна музеямі (Пірагова пад Кіевам, Наўгародскі музей-запаведнік, Талінскі этнаграфічны музей). Асноўныя недахопы прэпарата: лёгкая вымываемасць і гіграскапічнасць, з-за якой пры высокай вільготнасці (болей 70%) апрацаваная драўніна ўвільгочваецца.

Выкарыстоўваліся і фтарыстыя саставы. Практыка выкарыстання гэтых саставаў у Прыбалтыцы не выявіла істотных недахопаў. У музеі «Кіжы» выкарыстоўваўся прэпарат ББ (бура, борная кіслата). Гэты прэпарат добра пранікае ў матэрыял, драўніна не мяняе колеру і даволі добра абараняе ад агню. Прэпарат ПЗС забяспечвае добрую ахову ад біялагічных шкоднікаў, аднак пажаранебяспечны і мае непрыемны фенольны пах. Падобны па якасцях прэпарат пентахлорфенолят натрыя (ПХФН), але мае нізкую пранікальную здольнасць у матэрыял. Найбольш распаўсюджаныя прэпараты ПББ-211 і ПБС. Іх асаблівасць у тым, што ў матэрыяле ўтвараецца двухслаёвая ахоўная абалонка.

## § 3. Кансервацыя і рэстаўрацыя керамікі

*Кераміка* – (ад грэчаскага keramos – гліна, гліняны посуд) узнікла ў каменным веку, выраблены ўручную з цёмнай гліны і абпалены пры тэмпературы ад 450$^0$ да 750$^0$ С. Для захавання ад уздзеяння вадкасцяў пакрываюць палівай з розных колераў з вокіслаў металаў. Упершыню ўзнікла у Старажытным Егіпце.

Высокага ўзроўню дасягнула у антычных дзяржавах, асабліва у Старажытнай Грэцыі, дзе было распрацавана вельмі шмат рознастайных тыпаў

посуду (амфара, гідрыя і інш.), пакрываліся чорным лакам. Цікавы і роспісы керамікі, так званыя чорнафігурныя і чырвонафігурныя.

Паліваная кераміка развівалася на Усходзе у мусульманскіх краінах, дзе з'явіўся новы спосаб дэкору – роспіс люстрам, які прыдаваў кераміке залацісты ці серабрысты бляск. Такі дэкор быў перанесены ў Еўропу ў VIII ст. арабамі, так званая іспана-маўрытанская кераміка (г. Малага і г. Валенсія).

У Італіі небывалы ўздым керамікі ў часы Адраджэння. Італьянскія вырабы называюцца маёлікай (ад назвы вострава Маёрка). Выраблялiся з гліны светлых колераў, пакрываліся белай палівай і ўпрыгожваліся паліхромным роспісам.

У Германіі ў Рэйнскай вобласці да XVII ст. развівалась вытворчасць вырабаў з т.з. «каменных мас», у якія дадавалі палявы шпат, даваўшы вырабам пасля абпалу пры тэмпературы $1200^0$–$1400^0$С моцную трываласць, якая не патрабавала палівы.

У Нідэрландах у XVII ст. з'яўляецца знакаміты дэльфцкі фаянс (ад назвы г. Фаэнца ў Італіі). Фаянсавыя вырабы выконваліся з гліны светлых колераў, пакрываліся белай палівай, знешне падобны на ўсходні фарфор.

Фарфор – вышэйшы сорт керамікі. Выконваецца з белай гліны з дабаўленнем кварцу і «палявога шпату», абпальваецца пры тэмпературы $1250^0$–$1350^0$ С. Ад арабскага «фахеруры», што азначае самыя якасныя вырабы, якія прадназначаліся для імператара.

У заходнееўрапейскіх мовах выкарыстоўвалася слова «парцэлан» – «чаша» ці «марская ракавіна». Вынайдзена ў Кітаі у IV–VI стст. дэкарырваўся каляровымі палівамі, паліхромнымі роспісамі. У XIV–XVII стст. шырокае распаўсюджванне атрымаў падпаліўны роспіс сінім кобальтам. Кітайскі сакрэт (склад масы і спосаб вырабу) у Еўропе разгадалі ў пачатку XVIII ст. у Германіі на Мейсенскай мануфактуры. У Францыі ў XVII ст. атрымалі т.з. «мяккі фарфор», які адрозніваўся ад кітайскага. На Севрскай мануфактуры быў выпрацаваны асобы стыль фарфоравай пластыкі з бісквіта (без паліва і роспісу).

У Англіі ў 1740 г. наладжана вытворчасць фарфора, у склад якога уваходзіла касцяная зала.

Адной з самых шматлікіх катэгорый музейных прадметаў з'яўляецца старажытная кераміка. Часта яна займае больш за палову ад агульнай колькасці археалагічнай калекцыі гісторыка-краязнаўчага музея.

*Кераміка* – самая масавая катэгорыя знаходак пры раскопках пераважнай большасці археалагічных помнікаў амаль усіх перыядаў (за выключэннем помнікаў палеаліту і мезаліту).

Яшчэ адной вельмі важнай асаблівасцю археалагічнай керамікі з'яўляецца яе фрагментарнасць. Гэта абумоўлена крохкасцю посуду,



вялікай магчымасцю яго пашкоджання ў выніку механічных уздзеянняў. Вельмі рэдка археолагі знаходзяць цэлы посуд, які часцей за ўсё трапляецца ў пахаваннях.

Адразу трэба адзначыць, што пры прыёме керамікі, а таксама і іншых знаходак, да археолага, які перадае матэрыялы, неабходна выстаўляць наступныя патрабаванні:

1. Першасная апрацоўка керамічнага матэрыялу павінна праводзіцца яшчэ ў палявых умовах: кераміку неабходна ачысціць ад рэштак зямлі, вымыць і высушыць.
2. Кераміка абавязкова павінна быць зашыфравана (мець палявы нумар).
3. Разам з керамікай археолаг павінен перадаваць калекцыйны вопіс.

Звычайна кераміка захоўваецца досыць добра і як першы этап апрацоўкі не патрабуе нічога, акрамя прамыўкі ў праточнай вадзе і сушкі. Аднак бываюць выпадкі, калі чарапкі (асабліва ляпныя, слаба абпаленыя) аказваюцца вельмі крохкімі. Іх папярэдне замацоўваць, ужываючы метад паверхневага ўмацавання з выкарыстаннем у якасці мацуючага рэчыва 5 %-нага раствору клею БФ-2 і БФ-6, а таксама 5%-ны раствор полівінілбутыралі ў спіртабензоле. Раствор наносіцца на паверхню чарапка мяккім пэндзалем. Па меры яго ўцягвання аперацыя паўтараецца. Пасля прасушкі чарапкі набываюць трываласць, дастатковую для далейшай апрацоўкі. Калі кераміка шчыльная, добрага абпалу, то чарапкі можна класці ў таз з вадой і прамываць шчоткай, злёгку праціраючы паверхню кожнага фрагмента. Асабліва дасканала трэба прамываць зломы чарапкоў. Нязмытая са зломаў зямля перашкаджае магчымай у будучым рэстаўрацыі. Нетрывалыя фрагменты дрэннага абпалу трэба прамываць, не кладучы ў ваду. Іх прамыўка праводзіцца наступным чынам: чарапок бярэцца ў руку і мяккай шчоткай, змочанай ў вадзе, злёгку праціраецца паверхня керамікі.

Адносна ўмоўна можна лічыць, што існуюць два розныя по сваёй прыродзе віды забруджванняў на фрагментах керамікі: забруджванні, якія размешчаны на паверхні і, як правіла, не звязаны з чарапком хімічнай сувяззю (г.зн. проста гразь), і салявыя наслаенні, якія ўвайшлі ў структуру чарапка. Абавязкова трэба помніць, што змываюцца толькі рэшткі зямлі. Нельга змываць саляныя разводы, жалезістыя наросты і інш.

Добра прамытую кераміку раскладваюць на лістах фанеры або тоўстай паперы і прасушваюць у цяню на адкрытым паветры.

Пасля таго, як кераміка прыведзена ў належны стан, яе можна выкарыстоўваць для рэстаўрацыі пасудзін. Але перад тым, як аднаўляць старажытную пасудзіну, трэба правесці некаторую апрацоўку керамічнага матэрыялу. *Рассартіраваць кераміку* можна па чатырох найбольш лёгка вызачальных прыкметах:

1. Па колеру (як вонкавай, так і ўнутранай паверхняў).

2. Па складу фармовачнай массы.

3. Па апрацоўцы паверхні.

4. Па арнаменту.

*Сарціроўка па колеру* з'яўляецца не самай надзейнай. Адна і тая ж пасудзіна ў верхняй і ніжняй частках можа адрозніваецца па колеру з прычыны рознай ступені абпалу падчас вырабу і ўжывання. Напрыклад, дно і прыдонная частка досыць часта маюць больш цёмны колер у выніку ўздзеяння агню.

Сарціроўка керамікі *па складу фармовачнай масы* з'яўляецца найбольш складанай для музейнага супрацоўніка, які не мае спецыяльнай археалагічнай падрыхтоўкі. Пры высвятленні складу фармовачнай масы ў першую чаргу маецца на ўвазе вызначэнне дамешкаў (пясок, жарства, шамот, раслінныя і іншыя дамешкі), якія дадаваліся ў гліну, каб паменшыць усадку пры сушцы і пазбегнуць растрэсквання пасудзіны ў працэсе абпалу.

Наступны этап – сарціроўка керамічнага матэрыялу *па спосабу апрацоўкі паверхні*. Па спосабу апрацоўкі паверхні керамічны посуд бывае:

1. Гладкасценны (такое абазначэнне ўмоўнае, паколькі паверхня сасудаў часта не зусім гладкая з-за наяўнасці дамешак, напрыклад, жарствы).

2. З расчосамі грабянцоў – грэбнепадобнай прыладай разгладжвалі яшчэ сырую паверхню гаршка.

3. Штрыхаваны.

4. Тэкстыльны (з адбіткамі тканіны).

5. Глянцаваны.

6. Паліваны і г.д.

Пры сарціроўцы керамікі *па характару арнаментацыі* неабходна ўлічваць тое, што на паверхні пасудзіны можа адначасова размяшчацца некалькі відаў арнаменту.

Пасля завяршэння апрацоўкі музейны супрацоўнік па жаданні можа паспрабаваць састыкаваць адабраныя фрагменты. Гэта даволі марудны, але цікавы занятак. Пры гэтым не трэба забываць, што неабходна прытрымлівацца пэўнай асцярожнасці. Досыць часта краі фрагментаў вельмі нетрывалыя, і пры занадта моцнай састыкоўцы яны могуць раскрышыцца, што ў будучым ускладніць працу рэстаўратара пры аднаўленні пасудзіны. Асноўная мэта рэстаўратара – аднавіць пасудзіну, не сказіўшы пры гэтым яе форму. Дзеля гэтага трэба правільна падабраць чарапкі для склейвання. Спачатку падбіраюць чарапкі вянца, потым – донца. Больш за ўсё цяжкасцей сустракаецца пры падборы бакавых сценак.

Наступны этап – *склейванне* – найбольш адказны. Клеі, якія схопліваюць намертва, маюць значныя недахопы: верагодныя памылкі вельмі цяжка выправіць. Больш прыдатныя тэрмапластычныя клеі, а таксама тыя, што пасля ацвярдзення могуць зноў растварацца. Гэтыя якасці дазваляюць праводзіць па ходзе працы неабходную карэкціроўку.



Ужываюць як клеі на аснове фармальдэгіднай смалы (БФ-2, БФ-4, БФ-6), так і полівінілацэтатную смалу (10 %-ны раствор у ацэтоне) і полівінілбутыроль (8%-ны раствор у этылавым спірце з дабаўленнем каніфолі). Усе гэтыя кампазіцыі дазваляюць досыць лёгка выпраўляць недакладнасці. Як недахоп фармальдэгідных клеяў трэба адзначыць, што з цягам часу месцы склейкі цямнеюць. Вельмі неблагія з усіх пунктаў гледжання вынікі дае выкарыстанне клею ПВА.

У практычнай працы сустракаюцца недахопы аднаго ці некалькіх фрагментаў сасуда. Для надання гэтым экспанатам трываласці і паляпшэння іх эстэтычнага ўспрымання праводзіцца *гіпсоўка* – дапаўненне недахопаў гіпсам. Пры гэтым на адтуліну накладаецца пластылінавая пласціна (звонку ці знутры), пасля чаго яна запаўняецца гіпсавай кашыцай. Па меры ацвярдзення гіпсу пластылін убіраецца, паверхня зачышчаецца, а недакладнасці выпраўляюцца зразаннем або накладаннем гіпсу.

У тых выпадках, калі была сабрана толькі частка пасудзіны (пры гэтым захоўваўся профіль ад вянца да донца), удавалася цалкам аднавіць яе. Для гэтага вырабляўся пластылінавы злепак профілю (звонку ці знутры) Паступова прасоўваюцы злепак па акружнасці пасудзіны, з гіпсу далеплівалі яе недастаючыя часткі. Пасля зачысткі і сушкі ўзноўленыя паверхні таніраваліся акварэльнымі фарбамі. Тон рабіўся крыху больш цёмны ці светлы за натуральны, што дазваляе лёгка адрозніць захаваўшыяся фрагменты ад адноўленых. Арнамент на апошнія не наносіўся.

### § 4. Рэстаўрацыя аб'ектаў на паперы і пергаменце

Прадметы на папяровай аснове могуць быць самыя розныя: рукапісы, старадрукі, граматы, карты, графіка, чарцяжы, газеты, часопісы, архіўныя дакументы і інш.

Папера па сваіх фізіка-хімічных якасцях вельмі нетрывалы аб'ект. Па-першае, яна вельмі гіграскапічная, па-другое, светаадчувальная і вельмі хутка шкодзіцца і псуецца ад часу (старэнне), і ад розных механічных і біялагічных уздзеянняў.

*На захаванасць аб'ектаў* на паперы *уплываюць*:

1. Даўгавечнасць матэрыяла, з якога зроблены.

2. Умовы захавання.

3. Рэжым выкарыстання.

Выкарыстоўваюць *два віды рэстаўрацыйных работ*:

1. Кансервацыя і прафілактыка (замедліць працэс старэння).

2. Рэстаўрацыя да экспанавання.

При рэстаўрацыі і кансервацыі выкарыстоўваюць прыродныя і сінтэтычныя палімеры. Палімерныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюць пры рэстаўрацыі паперы і пергамента павінны адпавядаць шэрагу патрабаванняў:

1. Павінны быць устойлівы ад старэння (хімічна не змывацца, не змяняць колер ад змены тэмпературы і вільгаці).

2. Павінны быць бескаляровымі і празрыстымі.

3. Пры усыханні не павінны даваць усадкі, павінны ўтвараць эластычныя плёнкі.

4. Павінны добра злучацца з матэрыялам экспанату.

5. Павінны добра пранікаць ў экспанат, але захоўваць дастатковую пара- і водапранікальнасць рэчаў (папераў, пергаменту).

6. Не павінны аказваць хімічнае ўздзеянне на аб'ект.

7. Растварацца ў малатаксічных рэчывах (вада, этылавы спірт, талуол).

8. Ахоўваць экспанаты ад біялагічнага ўздзеяння.

Дзеля аховы ад біялагічных забруджванняў (плесень, грыбкі і інш.) выкарыстоўваюцца спецыяльныя біяцыдныя прэпараты. Сільна забруджаныя месцы апрацоўваюць пэндзалямі і тампонамі з растворам тымола. Папера высушваецца. Потым наносіцца біяцыдны прэпарат – АБП (раствор), на асобныя лісты, а потым іх сушаць.

Для надання папяровым дакументам экспазіцыйнага выгляду і паляпшэння іх стану выкарыстоўваюць адбельванне. Існуюць тры віды *адбельвання:*

1. Хімічнае адбельванне. У працэсе адбельвання ідзе разбурэнне і растварэнне матэрыялаў забруджвання, пры гэтым можа разбурацца і цэлюлоза – аснова паперы. Метад адбельвання выбіраюць у залежнасці ад паперы і яе фізіка-хімічных якасцяў. Выкарыстоўваюць акісляльнае адбельванне і ўзнаўляльнае адбельванне. Але нягледзячы на адбельванне, папера ўсё роўна з часам жаўцее ў залежнасці ад умоў захавання.

2. Акрамя хімічнага адбельвання выкарыстоўваецца і так званае *«сонечнае адбельванне».* Гэты метад распрацаваны нямецкім даследчыкам О. Вэхтэрам. Сутнасць гэтага метаду ў тым, што лісты паперы спачатку ўвільгочваюць, а потым памяшчаюць на сонца на тэрмін да 20 хвілін. Гэты метад дазваляе захаваць пацціну старых лістоў, што немагчыма пры хімічным адбельванні, пасля якога папера набывае вельмі белы колер. Адзіны недахоп гэтага метада, што правядзенне адбельвання залежыць ад надвор'я.

3. Таксама выкарыстоўваецца водна-светавы метад, калі лісты паперы змяшчаюць у вадзяную ванну і ўздзейнічаюць на іх светавымі промнямі рознай даўжыні. Усе гэтыя метады выбіраюцца ў залежнасці ад фізіка-хімічных якасцей паперы.



Шмат дакументальных помнікаў на пергменце: граматы, рукапісы, кнігі і г.д. Пры захаванні пергамента асноўная праблема – дэфармацыі ад перападаў тэмпературы і вільгаці. Пры вільгаці вышэй 70 % зморшчваецца, ніжэй 40% – пергамент становіцца крохкім, скручваецца, узнікаюць трэшчыны, разрывы, калі ёсць жывапіс – пачынаецца абсыпанне фарбавага слою.

Пергамент жаўцее ад дзейнасці пылу, які утрымлівае жалеза. Жалеза ў кантакце з шчолачнай паверхняй утварае гідравокіс. Жаўцее ад задубліравання ільняным алеем, які выкарыстаўваўся пры вырабе матэрыяла. Шкодзяць пергамент і некаторыя віды жалеза-галавых чарніл.

Цяжкаскі ўзнікаюць пры захоўванні грамат з воскавымі ці сургучнымі пячаткамі. Цяжкасць у тым, што захоўваць пергамент трэба ў распраўленым стане, а пячатку трымаць некранутай, дзеля гэтага выкарыстоўваць спецыяльныя паспарту з кардону з выразам для пячаткі.

Забруджванні з дакументаў выдаляюцца ластыкам ці сухім пэндзалем, сляды насякомых выдаляюць скальпелем.

Дэфармацыі пергамента выдаляюць метадам увільгочвання з наступным прэсаваннем між слаямі тоўстага сукна. Робіцца гэта некалькі разоў, потым пергамент сушыцца і пачынаецца падклейванне дакумента. Страты ўзнаўляюцца японскай паперай.

Пячаткі дадаюць тэхнічныя цяжкасці да працэсу рэстаўрацыі, асабліва пры прэсаванні, таму іх выдаляюць з дакумента. Самыя старажытныя пячаткі – з воску. З XVI ст. паступова з'яўляюцца сургучныя пячаткі. Воск – матэрыял не даўгавечны, ён паступова старэе, таму прыходзіцца аднаўляць і пячаткі. *Працэс рэстаўрацыі пячатак асобны:*

– зняццё паверхневых забруджванняў;
– умацаванне воскавай масы;
– зрошчванне пераломаў;
– рэканструкцыя страчаных частак.

Адрэстаўраваныя дакументы захоўваюць у спецыяльных каробках.

Для дакументальных помнікаў трэба ствараць належныя ўмовы экспанавання. Рукапісы і граматы экспануюць на пластыкавых падстаўках гарызантальна. Вельмі асцярожна адносіцца да экспанавання пергамента. Асвятленне павінна быць 30–50 люкс, свет не бліжэй 1 м ад экспаната, экспазіцыя не болей 3 месяцаў.

## § 5. Даследаванні і рэстаўрацыя твораў жывапісу

Карціны з тэхналагічнага пункту погляду – складаны комплекс розных матэрыялаў. Пашкоджаны могуць быць усе часткі карціны: аснова, палатно, падрамнік, фарбавы слой і інш. На практыцы пашкоджанне карцін амаль не сустракаюцца ізалявана, амаль заўсёды адно з іх цягне за

сабой іншае. Таму неабходна ведаць асноўныя віды пашкоджанняў дзеля правільнага апісання і стварэння належнага рэжыму захавання.

Адна з асноўных частак карціны – гэта палатно. Яно падвержана разнастайным уздзеянням з-за якіх парушаецца яго якасць, губляецца трываласць і ўпругасць (з-за ўзросту і хімічных працэсаў), асабліва калі холст прапітаны скіпінарам ці алеем. Таксама на палатне могуць утварацца зацёкі ад вільгаці, якая трапляе на палатно пры неспрыяльных умовах захавання (працёкі, перавозкі і г.д.). Сустракаюцца таксама апёкі ў выглядзе плямаў ці прапаленых наскрозь месцаў. Прычына гэтага можа быць не толькі ўздзеянне агню, але і няўмелае карыстанне прасам пры рэстаўрацыі карціны. На палатне могуць узнікаць кароблінасці, іх падзяляюць на агульныя і мясцовыя. Агульныя звычайна ў выглядзе хваляў па ўсяму палатну, ці выгнутая паверхня ў які-небудзь бок. Мясцовыя каробленасці ў выглядзе зборак уздоўж краю ці промнепадобных дэфармацыях у кутах карціны. На новым палатне каробленасці лёгка паддаюцца выпраўленню, на старых палотнах каробленасці больш трывалыя, іх звычайна называюць загрубелымі.

Яшчэ адзін від пашкоджанняў – *выцягнутасці*, яны ўтвараюцца з-за механічнага ўдаўльвання палатна. Яны могуць мець розную глыбіню і форму. Таксама сустракаюцца і механічныя пашкоджанні такія, як *прабоіны, праколы, прарэзы і страты палатна*. Асабліва пашкоджаны звычайна кромкі карціны з-за перацяжак палатна і ад няправільнай пераноскі.

Сярод іншых дэфармацый палатна сустракаюцца *змятасці і зломы*. Змятасці сустракаюцца, як правіла, у вуглах і на кромках, зломы могуць быць у любых месцах карціны. Такія дэфармацыі ўзнікаюць пры згібанні ці замінанні палатна не нацягнутага на падрамнік.

Адно з найбольш частых пашкоджанняў – гэта *забруджванне абаротнай стараны палатна*. Яно можа быць як агульным, так і мясцовым. Вылучаюць разнастайныя плямы ад алею і лака і пылавыя забруджванні. Заўсёды забруджаны старыя палотны, чым больш старая карціна, тым больш тоўсты слой бруду. Акрамя гэтага на звароце карціны сустракаюцца надпісы, наклейкі, сургучныя пячаткі і г.д.

Праводзячы агляд карціны, неабходна таксама звяртаць увагу на якасць і стан папярэдніх рэстаўрацый. Могуць сустракацца так званыя паўторныя пашкоджанні.

Свае пашкоджанні маюць і іншыя віды асновы: драўляныя дошкі, картон, папера.

Пашкоджанне грунта і фарбавага слою. Адзін з асноўных відаў пашкоджанняў – *адслаенне грунта*, звычайна гэта адбываецца з-за парушэння тэхналогіі нанясення грунта. Самым распаўсюджаным відам



пашкоджанняў з'яўляюцца *трэшчыны*, якія маюць назву *кракелюры*. Вылучаюць сетчатыя, паралельныя, сферычныя і павуцінападобныя кракелюры. Таксама яны падзяляюцца на старыя, раннія і механічныя.

*Уздуцці* – адставанне фарбавага слоя ад грунта з-за старэння асновы. Блізкія да гэтага віда пашкоджанняў – адслаенне і шалушэнне фарбавага слою?

*Запісы.* Да іх адносяць і таніроўкі страт фарбавага слою па палатне без рэстаўрацыі грунтоўкі, і разнастайныя «панаўленні».

Пакроўны лак ахоўвае фарбавы слой ад знешніх уздзеянняў і надае глыбіню і насычанасць жывапісу. Пашкоджанне лака меньш бяспечна для твораў жывапісу, так як лак заўсёды можна выдаліць і замяніць новым. Аднак, лак настолькі звязан з фарбавым слоем, што яго пашкоджанні адбіваюцца і на захаванні жывапісу. З цягам часу лак губляе сваю эластычнасць. На старых карцінах ён становіцца надта крохкім і рассыпаецца ў пыл. Усе пакроўныя лакі ад часу мяняюць свой колер, яны жаўцеюць і цямнеюць. Ступень пажаўцення і пацямнення залежыць ад якасці смол, якія ўваходзяць у склад лакаў.

На лакавым слоі лёгка ўзнікаюць драпіны і застаюцца сляды дотыку рук. Уздзеянне высокай тэмпературы выклікае ўтварэнне пульхіроў і пацямненняў лакавай плёнкі. І вельмі шкодны для жывапісу выпадковыя лакі, якія непрыдатны для пакрыцця карцін.

Усе гэтыя пашкоджанні павінны своечасова выяўляцца падчас прафілактычных аглядаў твораў жывапісу захавальнікамі калекцый. Усе вынікі даследавання фіксуюцца ў спецыяльнай дакументацыі. Простыя даследаванні праводзяцца непасрэдна ў фондасховішчах, больш складаныя ў рэстаўрацыйных майстэрнях і спецыяльных лабараторыях.

# ПЛАНЫ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

Семінар 1. **Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі**

1. Рэстаўрацыя антычных помнікаў у пачатку XIX ст.:
   а) адносіны да антычных помнікаў і іх стан да пачатку XIX ст.;
   б) рэстаўрацыйная дзейнасць Дж. Валадз'е і Р. Стэрна.
2. Стылістычныя рэстаўрацыі Э. Віяле-ле-Дзюка.
3. Новыя рэстаўрацыйныя тэорыі канец XIX–пачатак XX ст.:
   а) рэстаўрацыйныя тэорыі К. Бойто;
   б) археалагічная рэстаўрацыя;
   в) рэстаўрацыйныя метады Г. Джованнонні.
4. Рэстаўрацыя ў Расіі:
   а) рэстаўрацыйныя работы ва Уладзіміры;
   б) рэстаўрацыя архітэктурных помнікаў у Маскве;
   в) рэстаўрацыя Наўгародскіх помнікаў.

**Літаратура**


1. Кисель В.П. Памятники всемирного наследия. – Мн., 2000.
2. Подъяпольский С.С. Реставрация памятников архитектуры. – М., 1986.
3. Реставрация памятников архитектуры: Учеб. пособие для вузов / С.С. Подъяпольский, Г.Б. Бесанов, Л.А. Беляев и др. / Под ред. С.С. Подъяпольского. – 2-е изд. – М., 2000.
4. Реставрация музейных ценностей в СССР: Сб. статей. – М., 1982.


Семінар 2. **Міжнародныя дакументы па рэстаўрацыі і кансервацыі**

1. Перадумовы стварэння міжнародных дакументаў па рэстаўрацыі і кансервацыі.
2. Пакт Рэрыха.
3. Афінская хартыя.
4. Гаагская канвенцыя аб ахове культурных каштоўнасцей.
5. Венецыянская хартыя.
6. Кодэкс прафесійнай этыкі ICOM.
7. Хартыя аб ахове гістарычных гарадоў.
8. Заканадаўства РБ у галіне рэстаўрацыі і кансервацыі.

**Літаратура**


1. Венецыянская хартыя // Наша ніва. – 1994. – № 8–9.
2. Грейм Гардинер. Консервационное обследование: постановка проблем, связанных с обеспечением сохранности // Междунар. Журн. «Museum» (ЮНЕСКО). – 1996. – № 190. – С. 55–58.
3. Кодекс профессиональной этики / Междунар. совет музеев (ICOM) Б. м., б. г.
4. Конвенции и рекомендации ЮНЕСКО по вопросам охраны культурного наследия. Сб. документов. – М., 1990.
5. Международная хартия по консервации и реставрации памятников и достопримечательных мест (Венеция, 1964) // Архитектура СССР. – 1990. – № 4. – С. 22–23.
6. Международные нормативные документы по реставрационной этике / В.Г. Белозерова. – М., 1990. – 40 с. Консервация и реставрация музейных худож. ценностей. Экспресс-информ. / Гос. б-ка СССР им. В.И. Ленина. – Вып. 6.
7. Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных каштоўнасцей: праблемы і метады іх вырашэння // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі 23–24 лістапада 1999 г., Мінск. – Мн., 2000.


Семінар 3. **Даследаванне помнікаў архітэктуры пры рэстаўрацыі**

1. Агульная характарыстыка даследчых работ пры рэстаўрацыі.
2. Бібліяграфічныя і архіўныя даследаванні:
   а) гісторыка-бібліяграфічныя даследаванні;
   б) гісторыка-архіўныя даследаванні;
   в) іканаграфічныя крыніцы.
3. Спосабы фіксацыі помнікаў архітэктуры. Асноўныя віды фіксацыі (абмеры, фотафіксацыя, славеснае апісанне).
4. Археалагічныя даследаванні:
   а) мэты і задачы археалагічных даследдаванняў;
   б) падрыхтоўка археалагічных даследдаванняў;
   в) методыка вядзення раскопак помнікаў архітэктуры;
   г) вынікі і фіксацыя раскопак.
5. Вывучэнне помнікаў архітэктуры з дапамогай зандажоў:
   а) агульныя патрабаванні да зандажоў;
   б) асноўныя віды зандажоў;
   в) фіксацыя зандажоў.
6. Вывучэнне аналогій пры рэстаўрацыі помніка архітэктуры.

**Літаратура**


1. Беляев Л.А. Проведение археологических исследований при реставрации памятников архитектуры. – М., 1991.
2. Методика и технология консервации и реставрации памятников истории и культуры: Сб. научн. трудов. – М., 1988.
3. Методика реставрации памятников архитектуры. – М., 1961.
4. Реставрация памятников архитектуры: Учеб. пособие для вузов / С.С. Подъяпольский, Г.Б. Бесанов, Л.А. Беляев и др. / Под ред. С.С. Подъяпольского. – 2-е изд. – М., 2000.
5. Шепелев Л.Е. Архивные разыскания и исследования. – М., 1971.

Семінар 4. **Рэстаўрацыя станкавага тэмпернага жывапісу**

1. Матэрыялы тэмпернага жывапісу:
   а) аснова іконы;
   б) ляўкас;
   в) фарбавы слой;
   г) ахоўныя пакрыцці;
   д) аклады.
2. Разбурэнні і дэфекты абразоў:
   а) пашкоджані дошкі;
   б) разбурэнні ляўкаса;
   в) пашкоджанні фарбавага слою і ахоўных пакрыццяў.
3. Кансервацыя абразоў.
4. Рэстаўрацыя абразоў:
   а) умацаванне;
   б) выдаленне;
   в) узнаўленне;
   г) рэстаўрацыйнае ахоўнае пакрыццё.

**Літаратура**


1. Іканапіс Беларусі 15–18 стст. / Склад. Н.Ф. Высоцкая. – Мн., 1994.
2. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / В.Ф. Шматаў. – Мн., 2002.
3. Реставрация станковой темперной живописи: Уч. пособие для рестав. отд-ний худ. училищ / Г.А. Богданов, Е.М. Кристи, В.В. Филатов, С.В. Филатов; под ред. В.В. Филатова. – М., 1986.
4. Выгонная А.А. Основы реставрации памятников архитектуры, монументальной и станковой живописи: Уч. пособие / Под ред. Г.П. Жаровиной. – Мн., 2000.


Семінар 5–6. **Рэстаўрацыя архітэктурных помнікаў на Беларусі**

1. Рэстаўрацыя помнікаў г. Мінска
2. Рэстаўрацыя помнікаў г. Гродна
3. Рэстаўрацыя помнікаў г. Брэста.
4. Рэстаўрацыя помнікаў г. Гомеля.
5. Рэстаўрацыя помнікаў г. Магілёва.
6. Рэстаўрацыя помнікаў г. Віцебска
7. Рэстаўрацыя беларускіх замкаў.

**Літаратура**


1. Багласаў С.Г. Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. – Мн., 1984.





2. Багласаў С.Г. Верхний город Минска: проблемы реконструкции // Строительство и архитектура Беларуси. – 1982. – № 2.
3. Кулагін А.М. Архітэктурная культура праваслаўя на Беларусі: Помнікі культавага дойлідства на Беларусі // Каштоўнасці мінуўшчыны-3. – Мн., 2000.
4. Черепица В.Н. Гродненский православный некрополь. – Гродно, 2001.
5. Матэрыялы II Міжнароднай канферэнцыі па праблемах музеефікацыі унікальных гістарычных тэрыторый. – Полацк, 1996.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. – Мн., 1984–1988.
7. Сычёв А.В. Охрана природы и архитектуры: градостроительные аспекты рационального использования ландшафта Белоруссии. – Мн., 1978.


Семінар 7. **Рэстаўрацыя музейных прадметаў**

1. Рэстаўрацыя і кансервацыя керамікі:
   а) класіфікацыя керамікі;
   б) тыпы керамічнага посуду;
   в) спосабы рэстаўрацыі.
2. Рэстаўрацыя і кансервацыя тканін і адзення:
   а) класіфікацыя тканін;
   б) даследаванні тканін і адзення;
   в) кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з тканіны.
3. Рэстаўрацыя і кансервацыя дакументальных помнікаў:
   а) рэстаўрацыя кніг;
   б) рэстаўрацыя паперы;
   в) рэстаўрацыя пергамента.

**Літаратура**


1. Консервация и реставрация книг: Методические рекомендации. – М., 1987.
2. Консервация и реставрация музейных ценностей. Объекты на бумаге и пергаменте / Материалы конференции. Труды ГИМ. – М., 2002. –Вып. 129.
3. Кроллау Е.К. Температурно-влажностный и световой режим музеев. – М., 1971.
4. Методика и технология консервации и реставрации памятников истории и культуры: Сб. науч. трудов. – М., 1988.
5. Реставраторам и хранителям библиотечных фондов: Методические рекомендации / [Сост. Бурцева и др.] 1981.
6. Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных каштоўнасцей: праблемы і метады іх вырашэння / Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі 23–24 лістапада 1999 г., Мінск. – Мн., 2000.

# ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Рэстаўрацыя і кансервацыя. Вызначэнне паняццяў.
2. Гісторыя фарміравання прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі ў Еўропе.
3. Рэстаўрацыйная дзейнасць у Расійскай імперыі і СССР.
4. Гісторыя рэстаўрацыі на Беларусі.
5. Прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі.
6. Асноўныя віды рэстаўрацыйных работ.
7. Вывучэнне помнікаў архітэктуры падчас рэстаўрацыі.
8. Віды зандажоў на архітэктурных помніках.
9. Міжнародныя дакументы ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі.
10. Вывучэнне і захаванне твораў станкавага алейнага жывапісу.
11. Кансервацыя і рэстаўрацыя алейнага жывапісу.
12. Кансервацыя і рэстаўрацыя тэмпернага жывапісу.
13. Вывучэнне і рэстаўрацыя керамікі.
14. Кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з дрэва.
15. Кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з жалеза.
16. Ачыстка і кансервацыя нумізматычных прадметаў.
17. Кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з каляровых металаў.
18. Кансервацыя і рэстаўрацыя аб'ектаў на паперы.
19. Вывучэнне і рэстаўрацыя пергаменту.
20. Рэстаўрацыя тканін і адзення.



# ДАДАТКІ

## Кансерватар-рэстаўратар: азначэнне прафесіі

Прадмова

«Гэты дакумент, складзены працоўнай групай па падрыхтоўцы кадраў у вобласці кансервацыі і рэстаўрацыі Міжнароднага камітэта кансервацыі, быў прыняты на сёмым пасяджанні камітэта (Капенгаген, 1984).

1. *Уступ*

1.1. Мэтай дадзенага дакумента з'яўляецца азначэнне задач, прынцыпаў, а таксама асноўных патрабаванняў, прад'яўляемых да прафесіі кансерватара-рэстаўратара (спецыяліста ў вобласці кансервацыі і рэстаўрацыі).

1.2. У большасці краін пакуль не існуе азначэння прафесіі кансерватара-рэстаўратара; у цяперашні час кансерватарам або рэстаўратарам завуць кожнага, хто займаецца кансервацыяй або рэстаўрацыяй, незалежна ад узроўню яго падрыхтоўкі.

1.3. Імкненне да выпрацоўкі прафесійнай этыкі і норм як у дачыненні прадметаў, якія падвяргаюцца ўмяшанню, так і іх уладальнікаў, прыводзіла да неаднаразовых спроб даць азначэнне дадзенай прафесіі, каб аддзяліць яе ад іншых, блізкіх да яе спецыяльнасцей і сфармуляваць адпаведныя патрабаванні, прад'яўляемыя да падрыхтоўкі такога работніка. Для іншых прафесій – лекара, юрыста або архітэктара – гэта ўжо пройдзены этап. Зараз варта даць азначэнне прафесіі кансерватара-рэстаўратара, што дазволіць ёй набыць свой статут, падобны таму, які маюць блізкія да яе вобласці: захаванне, археалогія або навуковая праца.

2. *Праца кансерватара-рэстаўратара*

2.1. Праца кансерватара-рэстаўратара (кансервацыя) складаецца з вывучэння тэхнічнага стану культурных каштоўнасцяў, іх абароне, а таксама кансервацыі і рэстаўрацыі.

Вывучэнне тэхнічнага стану – папярэдняя працэдура; яе задачай з'яўляецца азначэнне першапачатковай структуры прадмета і матэрыялаў, з якіх ён зроблены, ступені пашкоджанняў, разбурэнняў і страт, а таксама складанне адпаведных дакументаў.

Абарона – дзеянні, прадпрымаемыя для таго, каб прыпыніць (запаволіць) альбо папярэдзіць знос або разбурэнне прадмета шляхам уздзеяння на сераду, у якой ён находзіцца, а таксама ўмацаванні яго структуры з мэтай падтрымання прадмета па магчымасці ў стабільным стане.

Рэстаўрацыя – меры, прымаемыя для вяртання разбуранаму або пашкоджанаму прадмету ранейшага аблічча; пры гэтым вымушаныя адступы ў

дачыненні яго эстэтычнай і гістарычнай цэласнасці павінны быць мінімальнымі.

2.2. Кансерватары-рэстаўратары працуюць у музеях, афіцыйных установах, якія займаюцца аховай спадчыны, у рэстаўрацыйных арганізацыях або ў якасці незалежных спецыялістаў. Яны павінны ведаць асаблівасці матэрыяльнай структуры прадметаў, якія маюць гістарычную і мастацкую каштоўнасць, з тым каб захоўваць іх ад разбурэння, а таксама дапамагаць нам лепш ацэньваць іх годнасць і адрозніць аўтарскае ад найбольш позніх дапаўненняў.

3. *Класіфікацыя дзеянняў кансерватараў-рэстаўратараў*

3.1. Асабліва вялікая адказнасць спецыялістаў у працы з незаменнымі помнікамі культуры, якія часта з'яўляюцца унікальнымі і маюць вялікае мастацкае, рэлігійнае, гістарычнае, навуковае, культурнае, сацыяльнае або эканамічнае значэнне. Каштоўнасць такіх прадметаў складаецца ў спосабе іх стварэння, у інфармацыі, якая змяшчаецца ў іх як у гістарычных дакументах, карацей кажучы, у іх сапраўднасці. Гэтыя прадметы, «ці высокамастацкія творы або проста прадметы паўсядзённага побыту, з'яўляюцца істотным выразам духоўнага, рэлігійнага, мастацкага жыцця мінулага, часта дакументальнымі сведкамі пэўнага гістарычнага становішча».

3.2. Дакументальны характар прадметаў, якія ўяўляюць гістарычную каштоўнасць, з'яўляецца той асновай, на якой будуецца даследчая праца ў вобласці гісторыі мастацтва, этнаграфіі, археалогіі і іншых навуковых дысцыплін. Таму вельмі важна не парушыць іх фізічную цэласнасць.

3.3. Паколькі ўсякае кансервацыйнае або рэстаўрацыйнае ўмяшанне здольна прычыніць прадмету шкоду, кансерватар-рэстаўратар павінен працаваць у самым цесным кантакце з тым, хто нясе адказнасць за калекцыі, або іншым спецыяістам, каб разам усталёўваць межы ўмяшання, адлучаючы магчымае ад немагчымага, меры, якія дапамагаюць выявіць якасць прадмета, ад дзеянняў, што могуць нанесці яму шкоду.

3.4. Кансерватар-рэстаўратар павінен усведамляць дакументальную прыроду прадметаў. Кожны з іх у комплексе – з'яўляецца носьбітам гістарычных, стылістычных, іканаграфічных, тэхнічных дадзеных, а гэтак жа інфармацыі, звязанай з эстэтыкай, інтэлектуальным або духоўным жыццём. Таму неабходна, каб у сваіх даследаваннях і ў працы з прадметам кансерватар-рэстаўратар выяўляў разуменне гэтай асаблівасці прадмета і ўлічваў яе пры выкананні саіх задач.

3.5. Кожнай працы з музейным прадметам павінна папярэднічаць навукова-метадычнае вывучэнне, якое дазваляе атрымаць аб ім самае вычарпальнае прадстаўленне і прадугедзець усе магчымыя наступствы ўздзеяння на прадмет. Тым, хто не ў стане ажыццявіць гэтую працу, з-за нядосыць высокага прафесійнага ўзроўню, з-за адсутнасці цікавасці да яе або па якой-небудзь іншай прычыне – нельга даверыць апрацоўку прадмета.



Толькі дасведчаны і добра падрыхтаваны кансерватар-рэстаўратар здольны зрабіць дакладныя высновы з такога вывучэння і прадбачыць наступствы прымаемых рашэнняў.

3.6. Любая праца з помнікамі гісторыі або мастацтва павінна здзяйсняцца ў адпаведнасці з агульным навукова-метадалагічным падыходам, уключаючым у сябе: вывучэнне крыніц, аналіз, інтэрпрэтацыю і абагульненне. Толькі пры такім падыходзе можна захаваць у працэсе апрацоўкі фізічную цэласнасць прадмета і зрабіць зразумелым яго значэнне. Больш таго, пашыраючы нашы магчымасці ў плане расшыфроўкі закладзенага ў прадмеце зместу, гэты падыход спрыяе атрыманню новых ведаў.

3.7. Кансерватар-рэстаўратар мае справу непасрэдна з прадметам. Яго работа – гэта першым чынам майстэрства рук. Але як спецыялісту па кансервацыі і рэстаўрацыі, яму патрэбны неабходныя тэарэтычныя веды і ўменне, ацаніўшы сітуацыю, рэагаваць на яе неадкладна і адпаведным вобразам. Пры гэтым ён павінен прадбачыць наступствы сваіх дзеянняў.

3.8. Першараднае значэнне мае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых прафесій, бо сёння кансерватар-рэстаўратар працуе ў складзе комплекснай брыгады. Кансерватар-рэстаўратар не можа адначасова быць мастацтвазнаўцам, спецыялістам у вобласці хіміі або іншых натуральных і гуманітарных навук. У сваёй працы кансерватару-рэстаўратару неабходна звяртацца да вынікаў пошукаў і даследаванняў навукоўцаў. Такое супрацоўніцтва будзе плённым толькі ў тым выпадку, калі кансерватар-рэстаўратар будзе здольны з навуковай дакладнасцю сфармуляваць цікавыя для яго пытанні, а затым асэнсаваць атрыманыя адказы ў дачыненні да сваёй працы.

4. *Роднасныя прафесіі. Падабенства і адрозненне*

4.1. Прафесійная дзейнасць кансерватара-рэстаўратара адрозніваецца ад работы мастака або майстра. Галоўным адрозненнем з'яўляецца тое, што кансерватар-рэстаўратар не стварае новых прадметаў культуры. Фізічнае аднаўленне таго, што ўжо не існуе або не можа быць захавана,- гэтая справа майстроў прыкладнага мастацтва або рамеснікаў: кавалёў, пазалотнікаў, чырвонадрэўшчыкаў, мастакоў-дэкаратараў і іншых. Аднак усе яны могуць шырока выкарыстаць у сваёй працы вынаходкі і веды кансерватараў-рэстаўратараў.

4.2. Толькі добра навучаны і адукаваны, дасведчаны ў асаблівасцях помніка кансерватар-рэстаўратар мае права рашыць пытанне аб магчымасці працы мастака або іншага кансерватара-рэстаўратара з прадметам, маючым гістарычную або мастацкую каштоўнасць. Толькі такі работнік, сумесна з захавальнікам або іншым спеыялістам валодае ўсімі сродкамі для таго, каб дбайна вывучыць прадмет, вызначыць яго стан і ацаніць дакументальнае значэнне.

*5. Падрыхтоўка кансерватараў-рэстаўратараў*

5.1. Для таго, каб авалодаць усімі пералічанымі вышэй якасцямі і спецыяльнымі прафесійнымі ведамі, кансерватары-рэстаўратары павінны атрымоўваць мастацкую, тэхнічную і навуковую падрыхтоўку на аснове поўнай агульнай адукацыі.

5.2. У курс такой падрыхтоўкі патрэбна бы ўвесці набыццё навыкаў ручной працы, атрыманне тэарэтычных ведаў аб матэрыялах і тэхніцы іх апрацоўкі, курс навуковай метадалогіі, неабходнай для таго, каб рашаць праблемы кансервацыі на аснове сістэмнага падыходу, абапіраючыся на строга навуковыя дадзеныя і крытычна асэнсоўваючы атрыманыя вынікі.

5.3. Праграма тэарэтычнай падрыхтоўкі павінна ўключаць наступныя тэмы:

- гісторыя мастацтва і цывілізацый;
- метады даследаванняў і дакументавання;
- матэрыялы і тэхналогія;
- тэорыя і этыка кансервацыі і рэстаўрацыі;
- гісторыя і тэхналогія кансервацыі і рэстаўрацыі;
- хімічныя, біялагічныя і фізічныя аспекты працэсу разбурэння і метады кансервацыі.

5.4. Важнай часткай праграмы з'яўляецца стажыроўка. На завяршальнай стадыі навучэнцы павінны падрыхтаваць выпускную або дыпломную працу, па заканчэнні ім уручаецца дакумент, які прыраўноўвацца да ўніверсітэцкага дыплома.

5.5. На ўсіх стадыях падрыхтоўкі кансерватараў-рэстаўратараў галоўную ўвагу варта надаваць практычным заняткам. Пры гэтым не трэба забываць аб неабходнасці развіваць і ўдасканальваць разуменне важнасці тэхнічных, навуковых, гістарычных і эстэтычных фактараў. Асноўная мэта навучання – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў у вобласці кансервацыі і рэстаўрацыі, здольных выконваць і дэталёва дакументаваць самыя складаныя працы, з тым каб іх дзейнасць і назапашаная інфармацыя спрыялі не толькі справе захавання музейных каштоўнасцяў, але адначасова і глыбейшаму разуменню саміх прадметаў, звязаных з гісторыяй і мастацтвам.

Капенгаген, верасень, 1984 г.



# ДАМОВА АБ АБАРОНЕ МАСТАЦКІХ І НАВУКОВЫХ УСТАНОЎ І ГІСТАРЫЧНЫХ ПОМНІКАЎ (ПАКТ *РЭРЫХА*)

АРТЫКУЛ І.

Гістарычныя помнікі, музеі, навуковыя, мастацкія, адукацыйныя і культурныя ўстановы лічацца нейтральнымі і карыстаюцца павагай і абаронай ваюючых бакоў.

Такой жа павагай і абаронай карыстаюцца супрацоўнікі вышэйназваных устаноў.

Такая жа павага і абарона распаўсюджваюцца на гістарычныя помнікі, музеі, навуковыя, мастацкія, адукацыйныя і культурныя ўстановы як падчас вайны, так і ў мірны час.

АРТЫКУЛ ІІ

Нейтралітэт, абарона і павага да помнікаў і ўстаноў, згаданых у папярэднім артыкулу, прызнаюцца на ўсёй тэрыторыі, якая находзіцца пад юрысдыкцыяй кожнай з Дзяржаў якія падпісаліся і далучыліся, незалежна ад дзяржаўнай прыналежнасці указаных помнікаў і ўстаноў.

Адпаведныя ўрады згаджаюцца распачаць неабходныя меры ў вобласці ўнутранага заканадаўства сваіх краін для забеспячэння такой абароны і павагі.

АРТЫКУЛ ІІІ

Для пазначэння помнікаў і ўстаноў, паказаных у артыкуле І, будзе выкарастаны адметны сцяг (чырвоная акружнасць з трыма чырвонымі кружкамі ў сярэдзіне на белым фоне) у адпаведнасці з узорам, прыкладаемым да дадзенай Дамовы.

АРТЫКУЛ IV

Урады Дзяржаў, якія падпісалі дадзеную Дамову або далучыўшыхся да яе, адначасова з падпісаннем Дамовы або далучэннем да яе, або ў іншы час, накіроўваюць у Панамерыканскі саюз пералік помнікаў і ўстаноў, якім яны жадаюць забяспечыць абарону, прадугледжаную ў дадзенай Дамове.

Панамерыканскі саюз, у сваю чаргу, накіроўвае іншым урадам спіс помнікаў і ўстаноў, згаданых у дадзеным артыкуле, а таксама інфармуе іншыя ўрады аб любых зменах у паказаным пераліку.

АРТЫКУЛ V

Помнікі і ўстановы, паказаныя ў артыкуле І, пазбаўляюцца прывілеяў, прадугледжаных у дадзенай Дамове, у выпадку іх выкарыстання ў вайсковых мэтах.

АРТЫКУЛ VI

Дзяржавы, якія не падпісалі сапраўдную Дамову ў дзень яго падпісання, могуць падпісаць яе або далучыцца да яе ў любы час.

АРТЫКУЛ VII

Дэпазітарам дакументаў па далучэнні, ратыфікацыі або дэнансацыі Дамовы будзе Панамерыканскі саюз, які апавяшчае ўсе Дзяржавы, што

падпісалі сдадзеную Дамову або якія далучыліся да яе, аб кожным дакуменце, перададзеным саюзу на захоўванне.

АРТЫКУЛ VIII

Сапраўдная Дамова можа быць дэнансавана ў любы час любой з дзяржаў, якія падпісалі або што далучыліся да яе, пры гэтым дэнансацыя ўступае ў сілу праз тры месяца пасля апавяшчэння аб ёй іншых Дзяржаў, якія падпісалі сапраўдную Дамову або што далучыліся да яе.

Уступ у сілу Дамовы засведчылі і падпісалі яго ад імя сваіх урадаў паўнамоцныя прадстаўнікі Дзяржаў пасля поўнага выканання іх паўнамоцтваў у адпаведнай і належнай форме і змацавалі Дамову сваімі пячаткамі, праставіўшы дату супраць сваіх подпісаў.

Вашынгтон, 15 красавіка 1935 г.

## МІЖНАРОДНАЯ ХАРТЫЯ ПА АХОВЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ГАРАДОЎ
(Вашынгтон, 1987)

### УВОДЗІНЫ І АЗНАЧЭННЕ

Узнікнуўшы ў выніку стыхійнага развіцця або па прадуманаму плану, усе гарады свету ўяўляюць сабою матэрыяльны выраз розных грамадскіх сістэм, якія існавалі на працягу ўсяго гістарычнага працэсу, і таму ўсе яны з'яўляюцца гістарычнымі.

Сапраўдная Хартыя, прысвечаная вялікім і малым гарадам, гістарычным цэнтрам або кварталам з іх прыродным або створаным чалавекам асяроддзем, якія, акрамя сваіх якасцяў гістарычнага дакумента, выяўляюць каштоўнасці, уласцівыя традыцыйным гарадскім цывілізацыям. Аднак гэтыя гарады находзяцца пад пагрозай пашкоджання, разбурэння і нават знішчэння пад уздзеяннем урбанізацыі, народжанай індустрыяльнай эрай і ўласцівай сёння ўсім грамадствам.

Перад тварам такой, часта драматычнай, сітуацыі, якая выклікае страты культурнага, сацыяльнага і нават эканамічнага характару, Міжнародная рада па пытаннях помнікаў і славутых месцаў (ІКАМОС) палічыла неабходным стварыць «Міжнародную Хартыю па ахове гістарычных гарадоў».

Дапаўняючы «Міжнародную Хартыю па кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў і славутых месцаў» (Венецыя, 1964), гэты новы тэкст вызначае прынцыпы і задачы, метады і спосабы дзейнасці, уласцівыя справе аховы гістарычных гарадоў, якія спрыяюць гармоніі індывідуальнага і грамадскага жыцця, захаванню той часткі культурнай спадчыны, нават сціплай, якае складае памяць чалавецтва.



### ПРЫНЦЫПЫ І МЭТЫ

1. Ахова гістарычных гарадоў і кварталаў, каб быць эфектыўнай, павінна быць часткай палітыкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця і ўлічвацца ў праектах раённай і горадабудаўнічай планіроўкі на ўсіх узроўнях.

2. Каштоўнасці, якія падлягаюць ахове – гэта гістарычны характар горада і сукупнасць матэрыяльных і мастацкіх элементаў, якія вызначаюць яго выяву, у прыватнасці:

а) канфігурацыя плану горада, вызначаная ўчасткам і вулічнай сеткай;

б) дачыненне паміж рознымі гарадскімі прасторамі: забудаванымі часткамі, вольнымі і занятымі зялёнымі насаджэннямі;

в) форма і выгляд будынкаў (унутраны і знешні), вызначаных сваёй структурай, аб'ёмам, стылем, маштабам, матэрыяламі, колерам і дэкаратыўнымі элементамі;

г) дачыненне паміж горадам і яго асяроддзем прыродным або створаным чалавекам;

д) розныя функцыі горада, набытыя на працягу яго гістарычнага развіцця.

Усякі замах на гэтыя каштоўнасці падвяргае небяспекі сапраўднасць гістарычнага гораду.

3. Удзел і прыцягненне жыхароў усяго горада неабходныя для поспеху яго аховы. Яно павінна здзяйсняцца пры любых акалічнасцях і садзейнічаць разуменню важнасці гэтай справы ўсімі пакаленнямі. Ніколі нельга забываць, што ахова гістарычных гарадоў і кварталаў першым чынам дакранаецца іх насельнікаў.

4. Умяшанне ў структуру гістарычнага квартала або горада павінна здзяйсняцца з асцярожнасцю, метадычна і дакладна, пазбягаючы ўсякага дагматызму, але з улікам спецыфічных праблем у кожным асобным выпадку.

### МЕТАДЫ І СРОДКІ

5. Планаванню аховы гістарычных гарадоў і кварталаў павінна спрыяць комплексная даследчая праца. План аховы павінен уключаць аналіз дадзеных, а менавіта: археалагічных, гістарычных, архітэктурных, тэхнічных сацыялагічных і эканамічных, а таксама выразна вызначаць галоўную скіраванасць і метады дзеянняў, якія неабходна распачаць з юрыдычнай, адміністрацыйнай і фінансавай пунктаў погляду. План аховы павінен ставіць сваёй мэтай дасягненне гарманічнага спалучэння гістарычных кварталаў з ансамблем усяго горада. У планах аховы павінны быць вызначаны будынкі, групы будынкаў, аб якіх варта асабліва паклапаціцца, будынкі для кансервацыі ў вызначаным стане і, толькі ў выключных выпадках, будынкі падлеглыя зносу. Іх стан да ўсякага ўмяшання павінен быць строга зафіксаваны ў дакументах. План павінен здзяйсняцца з згоды жыхароў.

6. У чаканні зацвярджэння плану аховы павінны быць прынятыя меры для кансервацыі помніка пры прытрымліванні прынцыпаў і метадаў Хартыі і Венецыянскай Хартыі.

7. Захаванне гістарычных гарадоў і кварталаў мяркуе своечасовы дагляд за будынкамі.

8. Новыя функцыі і сетка інфраструктуры, якія патрабуюцца сучаснаму гораду, павінны быць прыстасаваныя да спецыфікі гістарычных гарадоў.

9. Паляпшэнне стану жылых будынкаў павінна складаць адну з галоўных мэт аховы.

